Новыя правілы набыцця лекаў у аптэцы

СТАР.3

Беларускі дом для сям'і з Данецка

СТАР.4

Калядны настрой у Купалаўскім тэатры

СТАР.6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

4 ЛІСТАПАДА 2014 г. АЎТОРАК № 210 (27820) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Рыхтуй колы восенню

Жыхар вёскі Старыкі Браслаўскага раёна Уладзімір АЎСЮКЕВІЧ дэманструе суседзям трактар, сабраны сваімі рукамі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Жыллё

Мінск абагнаў Маскву па «квадратах»

ЦЯПЕР У НАШАЙ СТАЛІЦЫ НА АДНАГО ЖЫХАРА ПРЫХОДЗІЦЦА КАЛЯ 22 КВАДРАТНЫХ МЕТРАЎ ЖЫЛОЙ ПЛОШЧЫ

Спецыялісты падлічылі, што па сярэдняй забяспечанасці жыллём беларускі мегаполіс на тры «квадраты» апярэджвае Маскву, аднак больш чым у 1,5 раза ўступае заходнееўрапейскім гарадам.

Намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля групы кампаній «Твая сталіца» Святлана КУДЗЕЛКА адзначыла, што Мінск прырастае жылымі плошчамі хутчэй, чым насельніцтвам. Толькі ў другім квартале сёлета сярэдняя забяспечанасць жыллём вырасла на 1,4%. Нагадаю, што летась жыллёвы фонд павялічваўся для гараджан тэмпам 1,8%, у 2012 годзе — 1,9%, у 2011-м — на 2%, а ў 2010-м — і ўвогуле на 2,5%. Практычна не было росту ў 2007-2008 гадах — падчас сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу.

Па плошчы жылля на чалавека Мінск ужо пераўзыходзіць большасць сталіц краін СНД. У той жа час у гарадах Заходняй Еўропы на жыхара прыходзіцца звыш 35 квадратных метраў. Спецыялісты рынку нерухомасці падрыхтавалі аптымістычны прагноз, згодна з якім сярэдняя забяспечанасць жыллём у Мінску да 2020 года перавысіць 25 «квадратаў» на чалавека. Эксперты адзначаюць, што плошча жылля на душу насельніцтва ў Мінску расце разам з патрэбамі насельніцтва. Мінчане актыўна пераязджаюць з кампактных у больш габарытныя кватэры — стала больш удзельнікаў у «ланцуговых» здзелках. Калі яшчэ год таму ўдзельнікаў было ў сярэднім два-тры, то цяпер — каля пяці-шасці. Пры гэтым выраслa колькасць ахвотных абмяняць кватэру на другасным рынку на жыллё ў новабудоўлі.

Зараз на долю «ланцужкоў» прыпадае каля 70% здзелак. Цікавасць да такой альтэрнатыўнай схемы расце на фоне адсутнасці даступных жыллёвых крэдытаў і невысокай пакупніцкай здольнасці насельніцтва. Гэтай восенню на рынак таксама вярнуліся прамыя класічныя абмены — прадаўцы сталі больш ахвотна згаджацца на прапанаваныя варыянты абмену.

Днямі Нацыянальны статыстычны камітэт падлічыў, што за першае паўгоддзе жыллёвы фонд горада павялічыўся на 586 тысяч квадратных метраў. У выніку беларуская сталіца сёння мае каля 42,5 млн «квадратаў» жылля. Для параўнання, у Санкт-Пецярбургу агульная плошча ўсіх жылых памяшканняў большая ў 3 разы, у Маскве — у 5 разоў.

Таксама хутка ў Мінску расце другасны рынак жылля. Валавы аб'ём прапановы на гэтай пляцоўцы сёлета ў першым паўгоддзі павялічыўся больш чым на 40% у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Пры гэтым колькасць здзелак з кватэрамі за той жа перыяд скарацілася амаль на 25%. У сувязі з гэтым пакупнікі і эксперты чакалі зніжэння цэн, але гэтага практычна не адбываецца: рынак рэагуе стрымана і асцярожна. «На раўнавагу попыту і прапанова паказвае дастаткова стабільны кошт квадратнага метра з пачатку года — каля 1560 долараў», — падкрэсліла Святлана Кудзелка.

У бліжэйшыя два месяцы на рынку можа адбыцца невялікае ажыўленне. «Па-першае, беларусы традыцыйна імкнуцца вырашаць жыллёвае пытанне бліжэй да канца года. Так што попыт павінен пайсці ўверх, але з улікам вялікай прапановы гэта не прывядзе да росту цэн, — адзначыла намеснік дырэктара. — На рынку ў гэты час будуць запатрабаваны «аднапакаёўкі», а таксама недарагія «двушкі». Пры правільнай тактыцы знайсці пакупніка можна за кароткі час. Цяпер становіцца ўсё больш кватэр па актуальных цэнах. Такое жыллё магчыма прадаць даволі хутка».

Між тым мінчане сталі больш патрабавальнымі і ў выбары кватэры. Пакупніка сёння цікавяць не толькі месцазнаходжанне, але і тып дома, планіроўка памяшканняў, якасць рамонту. Яшчэ пару гадоў таму яны звычайна кіраваліся толькі цаной.

Сяргей КУРКАЧ.

НОВАЕ НАЗНАЧЭННЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў Валерыя Скакуна дырэктарам Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 3 лістапада. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

ЛІЧБА ДНЯ

Br1,3 трлн,

або 0,2% ВУП, склаў па выніках студзеня—верасня 2014 года прафіцыт рэспубліканскага бюджэту. Ён склаўся ў асноўным за кошт стрымлівання непершачарговых выдаткаў. Па інфармацыі Мінфіна, даходы рэспубліканскага бюджэту склалі Br87,7 трлн, або 67,7% удакладненага гадавога плана. За студзень-верасень 2014 года паступленне ПДВ склала Br49,1 трлн, або 73,8% удакладненага гадавога плана. Падатку на прыбытак паступіла Br11,1 трлн, або 54,2%. Акцызы паступілі ў суме Br15,6 трлн, або 68,8%. Даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці склалі Br13,3 трлн, або 50,9%. Паступленні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) склалі Br69,1 трлн, або 72,7% зацверджанага гадавога плана. Па стане на 1 кастрычніка 2014-га запазычанасць па падатках і зборах склала Br202,3 млрд і знізілася за верасень на Br130,2 млрд.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.11.2014 г.

Долар ЗША	10720,00	■
Еўра	13390,00	▼
Рас. руб.	246,50	▼
Укр. грыўня	824,58	▼

■ Актуальна

Кантракт — не пуга, а крыніца дадатковых гарантый,

або Як можна павысіць сацыяльны дабрабыт педагогаў

Як паказаў праведзены Беларускім прафсаюзам адукацыі і навукі маніторынг кантрактнай формы найму, у першым паўгоддзі гэтага года кантрактамі былі ахоплены больш як 80% работнікаў галіны.

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

— Ёсць некалькі акалічнасцяў, якія не могуць нас не радаваць, — прызнаецца **галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК.** — Па-першае, гэта ўстойлівы рост так званых доўгатэрміновых кантрактаў. Калі тэрмінам на адзін год было заключана толькі крыху больш за 21% ад агульнай колькасці кантрактаў, то колькасць кантрактаў тэрмінам на 5 гадоў дасягнула амаль 40%. Зразумела, што калі наймальнік прапануе свайму работніку максімальны тэрмін дзеяння кантракта, гэта выклікае ў педагога адчуванне большай стабільнасці, упэўненасць у заўтрашнім дні. Так, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях на пяцігадовы тэрмін заключаны 49,1% і 47,5% кантрактаў адпаведна.

Другая станоўчая тэндэнцыя — умацаванне ў кантрактах сацыяльных гарантый і ўключэнне ў іх дадатковых мер матэрыяльнага стымулявання, прадугледжаных Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №29 «Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны».

СТАР.2

■ Надвор'е

Без маразоў, аднак у выхадныя дажджы

На гэтым тыдні на тэрыторыю нашай краіны завітае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА. Пацяплее.

Таму з аўторка па чацвер, пры павышаным фоне атмасфернага ціску, істотных ападкаў не прадбачыцца. Толькі ўдзень 6 лістапада месцамі па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўдзень у аўторак складзе 5-11 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 14 градусаў. У ноч на сераду чакаецца ад 0 да 6 цяпла, па паўднёвым усходзе — 1-5 марозу, удзень — плюс 6-13 градусаў, а па паўднёвым захадзе да 14-16 цяпла. Прагназуецца, што ў чацвер стане цяплей, бо ўначы чакаецца плюс 1-8 градусаў, па паўднёвым усходзе яшчэ 0- мінус 3. Удзень — плюс 8-14 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны — да 16 цяпла.

У пятніцу 7 лістапада ў Беларусь прыйдзе атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы і стане больш воблачна і вільготна. Паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы. Раніцай у асобных раёнах туман. У ноч на пятніцу будзе 2-9 цяпла, удзень — плюс 6-13 градусаў, а ў Гомельскай вобласці — да 16 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у выхадныя ў нашу краіну завітае вільготнае паветра з Балтыйскага мора. Надвор'е крыху сапсуецца. Месцамі пройдуць непрацяглыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы стане плюс 1-8 градусаў, аднак пры праясненнях — 0-мінус 3 градусы. Удзень чакаецца ад 5 цяпла па поўначы да плюс 14 градусаў па поўдні краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Масква прызнала выбары ў ДНР і ЛНР, ЗША і ЕС — не

Масква лічыць законнымі выбары, якія прайшлі ў нядзелю, 2 лістапада, на паўднёвым усходзе Украіны, і паважае волевыяўленне мясцовых жыхароў. Пра гэта гаворыцца ў заяве МЗС РФ. «Выбраныя прадстаўнікі атрымалі мандат для вырашэння практычных задач па аднаўленні нармальнага жыцця ў рэгіёнах», — гаворыцца ў паведамленні. Між тым, як паведамляе Reuters, прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Федэрыка Магерыні лічыць нелегітымнымі мінулыя выбары кіраўнікоў і дэпутатаў парламентаў самаабвешчаных Данецкай і Луганскай народных рэспублік. Такой жа пазіцыі прытрымліваюцца і ЗША. Тым часам на выбарах кіраўніка ДНР па выніках апрацоўкі 100% бюлетэняў большасць галасоў набраў дзейны прэм'ер-міністр. Па інфармацыі ЦВК, за Аляксандра Захарчанку аддалі галасы 765 000 чалавек. Дзеючы кіраўнік ЛНР Ігар Платніцкі перамог на выбарах кіраўніка самаабвешчанай Луганскай народнай рэспублікі. За яго прагаласавалі 63,08% выбаршчыкаў.

У Францыі акцыі «супраць паліцэйскага гвалту» выліліся ў вулічныя баі

Жорсткія вулічныя сутыкненні паміж маніфестантамі і паліцыяй разгарнуліся ў суботу ў французскіх гарадах Нант і Тулуза. Актамі вулічнага вандалізму адзначыліся дэманстранты і ў шэрагу іншых гарадоў рэспублікі. Беспарадкі адбыліся на фоне акцыі пратэсту ў памяць пра маладога актывіста, які загінуў тыдзень таму падчас разгону чарговага мітынгу ў абарону навакольнага асяроддзя. Галоўная акцыя пратэсту была арганізавана ў горадзе Тулуза на поўдні Францыі. Дэманстрацыя, якая праходзіла ў суботу пад абразлівымі для паліцэйскіх лозунгамі, вельмі хутка перарасла ў беспарадкі. Каля 600 агрэсіўна настроеных маладых людзей, многія з якіх хавалі свае твары пад шалікамі, прыняліся граміць аўтобусныя прыпынкі, вітрыны крам, банкаматы. Яны таксама закідвалі паліцэйскіх цяжкімі прадметамі, на што тыя адказалі выкарыстаннем слёзатачывага газу і дубінак.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ААН: у атмасферы самая высокая канцэнтрацыя вуглякіслага газу за 800 тысяч гадоў

Узровень парніковых газаў у атмасферы дасягнуў максімальнага ўзроўню за 800 тысяч гадоў. Гэтыя даныя апублікаваны ў справаздачы Міжурадавай групы экспертаў па змене клімату ААН, паведамляе агенцтва Agence France-Presse. «Апошнія змены ў клімаце моцна паўплывалі на стан прыродных сістэм. Пацяпленне клімату — бясспрэчны факт», — гаворыцца ў дакументе. Эксперты ўпэўнены, што калі не будуць прыняты неабходныя меры па скарачэнні выкідаў вуглякіслага газу, пацяпленне працягнецца, а да канца XXI стагоддзя гэта можа прывесці да ўзнікнення незваротных наступстваў. Спецыялісты кажуць, што неабходна скараціць выкід вуглякіслага газу на 40-70% да 2050 года, а да 2100 года — практычна на 100%.

КАРАТКА

Генеральным сакратаром Беларускай федэрацыі хакея (ФХРБ) учора на пасяджэнні выканаўчага камітэта арганізацыі аднагалосна выбраны Яраслаў Заўгародні.

БПМ у сярэднім на душу насельніцтва з 1 лістапада 2014 года па 31 студзеня 2015 года ў разліку на месяц складае Br1 млн 396 тыс. 20. Гэта на 3,9 працэнта перавышае нарматыў, які дзейнічаў з 1 жніўня па 31 кастрычніка 2014 года.

XX Міжнародная спецыялізаваная аптовая выстаўка-кірмаш «Прадэкспа-2014» пройдзе ў Мінску з 11 па 14 лістапада. Пляцоўкай правядзення форуму стане Футбольны манеж.

У Беларусі аб'яўлена навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Яна будзе праводзіцца з 12 снежня 2014 года па 11 студзеня 2015 года. Цэнтральнай падзеяй акцыі стане навагодняе свята ў Палацы Рэспублікі. Мерапрыемства запланавана на 24 снежня гэтага года. Удзельнікамі свята стануць больш як 2 тыс. дзяцей з усіх рэгіёнаў краіны.

Бяспека на практыцы

Удзельнікі міжнароднай канферэнцыі пабачылі, як дзейнічаюць нашы антытэрарыстычныя падраздзяленні

Першая буйная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная барацьбе з тэрарызмам, завяршылася дэманстрацыяй спецыяльных аперацый на адным з мінскіх палігонаў. Напэўна, без гэтай жывой карціны ўсе размовы і сумесныя пошукі адказаў на надзённыя праблемы бяспекі былі б няпоўныя.

СТАР.2

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ISSN 1990 - 763X

■ Праблемы АПК

СТРАЦІЛІ 14 ТРЫЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ

Толькі таму, што ў сельскай гаспадарцы не хапае якасных кадраў

Такое меркаванне выказаў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з кандыдатамі на пасады кіраўнікоў сельгасарганізацый, якія праходзяць стажыроўку ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Акрамя таго, кіраўнік урада лічыць, што, калі выкладчыкі аграрных ВНУ за два гады навучання не ўбачылі схільнасці студэнта да абранай спецыяльнасці, трэба дапамагчы яму вызначыцца з другой прафесіяй. У цэлым жа Міхаіл Мясніковіч выказаў сур'ёзныя заўвагі ў адрас існуючай сістэмы адукацыі. Ён акцэнтаваў увагу на актуальных пытаннях кіравання ў АПК. На думку прэм'ера, усе тэхналогіі, распрацаваныя ў сельскай гаспадарцы, уся матэрыяльна-тэхнічная база, якая пастаянна ўмацоўваецца, не будуць даваць выніку, калі не будзе адпаведных адукаваных кіраўнікоў. «Мы распрацоўвалі новыя праекты ферм, удасканальвалі апрацоўку глебы і не займаліся дастаткова добра пытаннямі падрыхтоўкі кадраў», — канстатаваў Міхаіл Мясніковіч. Пры гэтым менавіта з-за недасканаласці кадравай работы галіна нясе велізарныя страты, якія вылічаюцца трыльёнамі рублёў. Так, непрадукцыйныя страты ў сельскай гаспадарцы ва ўмовах 2013 года прэм'ер-міністр ацаніў у 14 трлн рублёў.

Акрамя таго, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што заработная плата кіраўнікоў і спецыялістаў павінна мець асноўнае значэнне. «Тады не будзе праблем з замацаваннем кадраў на сяле, не будзе праблем з жыллём», — упэўнены прэм'ер. Тарыфная частка заработнай платы павінна быць дастаткова высокай, «каб чалавек ведаў, што нават ва ўмовах, напрыклад, непагадзі (паколькі рызыкі вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі вельмі высокія) ён сваю тарыфную частку атрымае». Але гэта не павінна спараджаць утрыманскія настроі, папярэдзіў кіраўнік урада.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ Неапраўданая рызыка

КАВАРНЫ ПЕРШЫ ЛЁД

55-гадовы мужчына ў сярэдзіне дня ішоў дадому праз парк «Фестывальны», што ў Савецкім раёне Гомеля, калі пабачыў падлеткаў, якія каталіся па лёдзе невялікага возера.

З мастка закаханых пенсіянер убачыў, што адзін з хлапчукоў выбег на сярэдзіну возера і праваліўся. Ён адразу зразумеў сур'ёзнасць сітуацыі, бо глыбіня вадаёма тут каля двух метраў. Мужчына схапіў дошку і папоўз да юнака, які спужаўся і панічна хапаўся за тонкі беражок лёду, які абломваўся. Выратавальнік-добраахвотнік і сам праваліўся ў ваду, але ж паспеў выкінуць школьніка на лёд бліжэй да берага, да медыкаў і супрацоўнікаў МНС, якія ў гэты момант пад'ехалі на дапамогу.

У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС расказалі, што рыхтуюць дакументы на ўзнагароджанне гамяльчаніна Віктара Коўгара за смелы ўчынак. Як высветлілася, 13-гадовы юнак прыехаў у абласны цэнтр з расійскага горада Арол на экскурсію. Медыцынская дапамога турысту не спатрэбілася. Між тым таўшчыня лёду на возеры была не больш за 3 см. Выратавальнікі заклікаюць бацькоў нагадаць сваім дзецям пра небяспеку першага лёду і растлумачыць ім пра наступствы такіх гульняў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

За апошні тыдзень у Чэрыкаўскім і Бабруйскім раёнах Магілёўшчыны абарвалася жыццё трох рыбакоў.

Выратавальнікі на вадзе б'юць трывогу: не паспеў на вадаёмах утварыцца лёд, як рыбакі пачалі правяраць яго на трываласць. У Бабруйскім раёне падобная рызыка каштавала жыцця адразу 2 пенсіянерам. Яны паставілі рыбалавецкія снасці за 100 метраў ад берага, а калі адправіліся па здабычу, праваліліся пад лёд і самастойна выратавацца не змаглі. Каб дастаць загінулых з глыбіні 2 метраў, выратавальнікам прыйшлося рабіць спецыяльны насціл. Прыкладна па такім жа сцэнарыі адбылася трагедыя і на затоне ракі Сож у Чэрыкаўскім раёне, дзе загінуў 59-гадовы мужчына.

— Мы кожны раз нагадваем, што лёд таўшчынёю ў 3-4 сантыметры вельмі небяспечны. Але ёсць рыбакі, на якіх не дзейнічаюць ніякія ўгаворы, — абураецца вадалазны спецыяліст Магілёўскай абласной службы выратавання на водах Мікалай Гаўрыленка. — Нядаўна сам бачыў, як на тонкім лёдзе ў затоцы ракі Днепр па вуліцы Фаціна ў Магілёве сядзелі чалавек 10 з вудамі. Калі б пад адным з іх лёд трэснуў, не выратаваўся б ніхто. Навошта так рызыкаваць, не разумею.

Дарэчы, ратавальнікі папярэджваюць, што бяспечным з'яўляецца лёд, таўшчыня якога складае не менш за 7 сантыметраў. І асабліва важна нагадаць аб гэтым дзецям.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

Кантракт — не пуга, а крыніца дадатковых гарантый...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта стала магчымым дзякуючы настойлівасці як выканаўчай улады, нашых сацыяльных партнёраў (Міністэрства адукацыі, упраўленняў, аддзелаў адукацыі выканкамаў, камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама і, безумоўна, наймальнікаў) — так і прафсаюзнага боку, што ўздымаў вышэйзгаданую праблему на ўсіх узроўнях. Там, дзе разумеюць неабходнасць дадатковай сацыяльнай падтрымкі работнікаў, як правіла, знаходзяць і магчымасці для гэтага.

Так, практычна ва ўсіх рэгіёнах Віцебскай вобласці ў больш за 94% кантрактаў з работнікамі сістэмы адукацыі прадугледжаны дадатковы заахвочвальны водпуск з захаваннем заработнай платы працягласцю ад 1 да 5 дзён. У 88,6% кантрактаў занатавана павышэнне тарыфнай стаўкі больш за 10%. У Буда-Кашалёўскім раёне, Віцебскім, Мёрскім, Ушацкім раёнах ва ўсіх кантрактах павышэнне тарыфнай стаўкі складае ад 30% да 50%.

У Мінску павышэнне тарыфнай стаўкі ад 10% да 30% прадугледжваюць больш за 70% кантрактаў.

ПАДТРЫМКА САМЫХ НІЗКААПЛАТНЫХ

У свой час галіновы прафсаюз праініцыяваў вяртанне да бестэрміновага працоўнага дагавора ў дачыненні да добрасумленных работнікаў сістэмы адукацыі, якія працавалі на ўмовах кантракту, пры наяўнасці жадання гэтых работнікаў. Бестэрміновы працоўны дагавор могуць выбраць і маладыя спецыялісты. Так, у Мінскай вобласці такой формай найму ахоплены 38,1% работнікаў сістэмы адукацыі.

— Мы заўважылі, што як толькі ў кантракт закладваюцца дадатковыя сацыяльныя і фінансавыя гарантыі, тут жа ў гэтых рэгіёнах павялічваецца і колькасць ахвотных заключыць кантракт на працяглы тэрмін, — падкрэслівае Ларыса Манюк. — Таксама даводзіцца канстатаваць, што ў шэрагу выпадкаў праз павышэнне тарыфнай стаўкі (акладу) кіраўніцтва сістэмы адукацыі асобных рэгіёнаў спрабуе падтрымаць фінансава пэўныя катэгорыі работнікаў галіны, якіх не хапае ў рэгіёне ці памер заработнай працы якіх незаслужана ніжэйшы за іншых работнікаў галіны адпаведнай кваліфікацыі. Дзесьці мясцовыя ўлады палічылі неабходным падтрымаць фінансава сацыяльна-педагагічную ці бухгалтарскую службу, дзесьці — дырэктарскі корпус. Стараюцца наймальнікі таксама падтрымліваць і нізкааплатныя катэгорыі работнікаў, без якіх, між іншым, функцыянаванне ўстаноў адукацыі будзе немагчымым: кухараў, кухонных рабочых, памочнікаў выхавальнікаў, дворнікаў і іншых.

Так, у Гродзенскай вобласці па рашэнні выканаўчых камітэтаў да службовых акладаў работнікаў гаспадарчых груп, цэнтралізаванай бухгалтэрыі, метадычных камітэтаў у кантрактах устаноўлены надбаўкі ад 30% да 50%. У Бераставіцкім раёне павышаны тарыфныя стаўкі нізкаплатным катэгорыям работнікаў (прыбіральшчыкам службовых памяшканняў, рабочым, вартаўнікам, кастэлянкам, работнікам харчовых блокаў).

Увогуле, як заўважылі ў галіновым прафсаюзе, рост паказчыкаў сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў адукацыі магчымы ў тым ліку пры вырашэнні пытанняў дадатковага матэрыяльнага стымулявання — у рамках кантрактнай формы найму ў спалучэнні з граматным планаваннем выдаткаў на аплату працы работнікаў адукацыі, у тым ліку на даплаты да ўзроўню мінімальнай заработнай платы нізкааплатным катэгорыям работнікаў, а таксама са своечасовым падлікам эканоміі фонду заработнай платы і накіраваннем яе на прэміраванне работнікаў. Гэта дазволіла па выніках першага паўгоддзя дасягнуць у Віцебскай і Магілёўскай абласцях паказчыкаў сярэднямесячнай заработнай платы настаўнікаў вышэй на 4,9% і 4,5% адпаведна за аналагічны агульнарэспубліканскі паказчык. Большае разыходжанне дасягнута толькі ў г.Мінску (6,4%).

Інфармацыя па выніках праведзенага галіновым прафсаюзам маніторынгу кантрактнай формы найму за першае паўгоддзе 2014 года

Работнікі, у дачыненні да якіх прымяняецца кантрактная форма найму — 80,1% ад агульнай колькасці работнікаў.

Наяўнасць у кантрактах павышэння тарыфнай стаўкі да 3% — 14,8% ад агульнай колькасці кантрактаў.

Наяўнасць у кантрактах павышэння тарыфнай стаўкі да 10% — 20,2% ад агульнай колькасці кантрактаў.

Наяўнасць у кантрактах павышэння тарыфнай стаўкі ад 10 да 30% — 10% ад агульнай колькасці кантрактаў.

Наяўнасць у кантрактах павышэння тарыфнай стаўкі ад 30 да 50% — 20,8% ад агульнай колькасці кантрактаў.

Наяўнасць у кантрактах дадатковага заахвочвальнага водпуску ад 3 да 5 каляндарных дзён — 26,7% ад агульнай колькасці кантрактаў.

Наяўнасць у кантрактах дадатковага 1 каляндарнага дня заахвочвальнага водпуску — 52,3% ад агульнай колькасці кантрактаў.

Зніжаць устаноўленую планку сацыяльных гарантый нельга. Яе можна толькі павышаць... І там, дзе разумеюць неабходнасць дадатковай сацыяльнай падтрымкі работнікаў, як правіла, знаходзяць і магчымасці для гэтага.

ПАШЫРЭННЕ ГАРАНТЫЙ

Пры гэтым прынятыя меры не з'яўляюцца вычарпальнымі, бо ў рамках ажыццяўлення галіновым прафсаюзам грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства аб працы прыходзіцца канстатаваць, што адсутнасць у кантрактах дадатковых мер матэрыяльнага стымулявання працы працягвае заставацца адным з асноўных парушэнняў у прымяненні кантрактнай формы найму, як, дарэчы, і перавод работнікаў на кантракт без арганізацыйных, вытворчых і эканамічных прычын. Працягвае прафсаюз і сумесную з сацыяльнымі партнёрамі працу над памяншэннем колькасці кантрактаў, заключаных на мінімальны тэрмін.

Тое, што пакуль не ўрэгулявана на нарматыўным узроўні, галіновы прафсаюз спрабуе вырашаць сумесна з Міністэрствам адукацыі у рамках галіновага пагаднення. Так, у рамках кантрактнай формы найму ў дапаўненне да нормаў заканадаўства пашыраны гарантыі адзінокім маці, бацькам, што выхоўваюць дзяцей без маці, удовам, якія не ўступілі ў новы шлюб, і іншым катэгорыям работнікаў. Абаронены правы маладых спецыялістаў, якім прадастаўляецца права выбару формы працоўнага дагавора, а таксама работнікаў перадпенсійнага ўзросту. Усе гарантыі распаўсюджваюцца на работнікаў, што не маюць дысцыплінарных спагнанняў. Акрамя таго, існуюць і гарантыі па датэрміновым скасаванні кантрактаў пры наяўнасці прычын, якія абцяжарваюць працяг працоўных адносін, іншых прычын сацыяльнага характару. Гэта далёка не поўны пералік дадатковых гарантый работнікам у рамках кантрактнай формы найму.

Даследчыкі канстатуюць, што галоўная загана педагагічнай прафесіі ў сучасным свеце — нестабільнасць занятасці. Таму намаганні галіновага прафсаюза накіраваны найперш на мінімізацыю гэтай нестабільнасці.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

ЮБІЛЕЙНЫ З'ЕЗД КПСС

Кампартыі былых савецкіх рэспублік збіраюцца аб'яднацца?

Фота БЕЛТА.

У мінулыя выхадныя адбыўся 35-ы з'езд Саюза камуністычных партый — камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Мінск сустракаў 17 дэлегацый КПСС. Наша сталіца для сустрэчы выбрана не выпадкова: тут у свой час адбыўся з'езд РСДРП. На 35-м з'ездзе падвялі вынікі працы партый за 5 гадоў. Па словах Генадзя Зюганава, лідара Камуністычнай партыі Расіі, саюз камуністаў умацаваўся і стаў адной з найбуйнейшых міжнародных арганізацый.

«Мы маем прамыя адносіны і дагаворы з найбуйнейшымі партыямі на планеце. Нядаўна падпісалі мемарандум з кампартыяй Кітая, якая не толькі праяўляе вялікую цікавасць і дэманструе падтрымку нашаму руху. Рэформы, якія праводзяцца ў Кітаі апошнія 30 гадоў, — унікальныя. Аналагаў у свеце практычна няма. Яны паўтарылі подзвіг СССР, які 30 гадоў, пачынаючы з 1917 года, таксама дэманстраваў самыя высокія тэмпы — перамог фашызм, прарваўся ў космас, стварыў ракетна-ядзерны парытэт. Кітай, які правёў такія рэформы, прадэманстраваў сёння ўсім, як магчыма выцягваць планету з эканамічнага крызісу, адначасова рэалізоўваць ідэі сацыялізму з кітайскай спецыфікай», — падкрэсліў Генадзь Зюганаў.

Таксама лідар расійскай кампартыі выказаў думку, што неабходна прыняць рэзалюцыю па ўкраінскім пытанні, дзе ўпершыню за 96 гадоў кампартыя не была выбрана ў Вярхоўную Раду. Па словах Пятра Сіманенкі, першага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПУ, працоўны народ страціў палітычную сілу, якая адстойвае іх інтарэсы.

Таксама на з'ездзе абмяркоўваліся пытанні падрыхтоўкі да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і да стагоддзя Вялікага Кастрычніка.

«Мы лічым, што час настаў гуртаваць усе дзяржаўна-патрыятычныя сілы. 4 лістапада ў Маскве пройдзе 50-тысячная маніфестацыя, у якой будуць удзельнічаць усе партыі руху», — расказаў Генадзь Зюганаў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

Бяспека на практыцы

Фотадыямкі Аляксандра ШАБЛЮКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Зразумела, з пункту погляду найбольш сур'ёзных пагроз мы больш за ўсё заклапочаны актыўнасцю такой арганізацыі, як «Ісламская дзяржава Ірака і Леванта», якая набыла гучанне як «ІДзІЛ», — лічыць **старшыня Навукова-кансультатыўнага савета пры Антытэрарыстычным цэнтры краін — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў Марыяна КАЧУБЕЙ**. — Гэта не зусім той фармат тэрарызму, да якога мы прызвычаіліся. Гэта ваенна-палявыя, вайсковыя аперацыі. Дзяржавы Садружнасці (СНД), якія знаходзяцца ў Цэнтральна-Азіяцкім поясе, вельмі ўважліва зараз ставяцца да дзеянняў гэтай групоўкі, бо баявыя дзеянні вядуцца ў непасрэднай блізкасці ад іх паўднёвых межаў. Наш Антытэрарыстычны цэнтр таксама адсочвае дзейнасць гэтай арганізацыі: рыхтуе сур'ёзныя, важкія аналітычныя даведкі, якія накіроўвае дзяржавам. Гэтая праблема актыўна абмяркоўваецца і падчас кансультацый, якія Цэнтр праводзіць з партнёрамі ў органах бяспекі цэнтральна-азіяцкіх краін. Сёння гэта самая гарачая тэма.

Удзельнікі мінскай канферэнцыі пагаджаліся, што напрамую Беларусі дзейнасць «Ісламскай дзяржавы» не пагражае, але, разам з тым, капсульных тэрыторый бяспекі на нашай планеце ўжо практычна не засталося: глабалізацыя зрабіла сваю справу. І тое, што ў шэрагах «Ісламскай дзяржавы» ваююць сотні і тысячы еўрапейцаў, у тым ліку грамадзяне Расійскай Федэрацыі мусульманскага веравызнання, павялічвае рызыку прамога або ўскоснага ўключэння нашых грамадзян у дзейнасць ІДзІЛ, лічаць спецыялісты.

Разам з абмеркаваннем і дэманстрацыяй антытэрарыстычных дзеянняў з выкарыстаннем самалётаў, верталётаў, лодак, браніраванай і іншай спецыяльнай тэхнікі ўдзельнікі канферэнцыі асаблівую ўвагу надалі самым звычайным сродкам масавай камунікацыі і інфармацыі.

— Цяпер інфармацыйная вайна — актуальнае пытанне. Нават калі няма гарачых эпізодаў баявых дзеянняў, то інфармацыйная вайна вядзецца заўсёды, — заўважыла Марыяна Качубей. — Зараз яна знаходзіцца ў стадыі абвастрэння і не відаць перспектыў, каб напал зніжаўся. Таму мы выступаем за тое, каб нашы нацыянальныя законы былі гарманізаваны. Не хачу сказаць, што яны павінны быць аднолькавыя, бо як юрыст вельмі добра разумею: нацыянальна-дзяржаўная спецыфіка павінна захоўвацца. Але нашы крыніцы заканадаўства па гэтых пытаннях павінны стыкавацца адна з адной, каб мы маглі працаваць ва ўзаемна падобных інфармацыйных і прававых палях.

Юрысты падкрэсліваюць, што, на жаль, у нашы дні інфармацыйная вайна разгортваецца па лініі нацыянальна-этнічнага і нацыянальна-культурнага супрацьстаяння. У такім кантэксце правядзенне на тэрыторыі Беларусі Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Партнёрства дзяржавы, грамадскага сектара і дзелавой супольнасці ў барацьбе з тэрарызмам» многія лічаць вельмі своечасовым. Нашай краіне ўдалося застацца адной з самых стабільных і бяспечных у гэтым плане на постсавецкай прасторы, нягледзячы на яе нацыянальную разнастайнасць і шматканфесійнасць. Беларусь мае каштоўны вопыт не толькі мірнага суіснавання, але і ўдалага спалучэння дзвюх культур — усходняй і заходняй.

Госці канферэнцыі пракаментавалі і праблему вярбоўкі ў экстрэмісцкія арганізацыі праз сацыяльныя сеткі. Напрыклад, калі праз старонку на рэсурсе «Аднакласнікі» грамадзянін Таджыкістана менш чым за год сумеў без асабістага кантакту завербаваць больш за 200 чалавек у тэрарыстычную арганізацыю «Джамраці Ансрулох», ён прыцягнуў увагу праваахоўнікаў розных краін. «Канешне, ніхто не збіраецца татальна кантраляваць сацыяльныя сеткі, закрываць іх, — сказала Марыяна Качубей. — Але трэба весці тлумачальную работу сярод карыстальнікаў сацыяльных сетак пра тое, што гэта — рэчы вострыя з абодвух бакоў і дастаткова небяспечныя. У сацыяльных сетках на сваіх асабістых старонках людзі размяшчаюць такую інфармацыю пра сябе, якая з'яўляецца «полем шакаладу» для любога вярбоўшчыка ў экстрэмісцкія арганізацыі. Трэба тлумачыць, што «сетка» — гэта не зялёны лужок, а міннае поле. На жаль, сёння сацыяльныя сеткі, якія з'яўляюцца сродкам камунікацыі, атрымалі шчыльны цень — сталі месцам вярбоўкі ў экстрэмісцкія арганізацыі».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ПАКУПНІКОЎ ЧАКАЮЦЬ НОВЫЯ «ГАРЫЗОНТЫ»

Тыдні бытавой тэхнікі айчынных вытворцаў пройдуць ва ўнівермагах сталіцы цягам лістапада-снежня.

Па ініцыятыве галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама разам з прамысловымі прадпрыемствамі, сярод якіх «Амкадор-Белвар», «Гарызонт», «Атлант», у буйных гандлёвых арганізацыях Мінска пройдзе пашыраны продаж бытавой тэхнікі, у тым ліку і навінак. Яны адбудуцца ў ЦУМе, ГУМе, гандлёвым доме «На Нямізе», ва ўнівермагу «Беларусь». Падчас продажу будуць праводзіцца розыгрышы прызоў і анкетаванне пакупнікоў, на месцах будуць працаваць кансультанты. Каб заахвоціць грамадзян, на тавар будзе павялічаны гарантыйны тэрмін. А пры набыцці халадзільніка, маразільніка ці пральнай машыны «Атлант» пакупніка чакае падарунак — электрачайнік.

Для тых, хто зацікавіўся, застаецца дадаць, што 10-16 лістапада, 8-14 снежня адбудуцца тыдні «Атланта»; 17-23 лістапада, 15-21 снежня — тыдні «Гарызонта»; 10-16 лістапада, 15-21 снежня — тыдні бытавой тэхнікі «Белвар».

Сяргей РАСОЛЬКА.

НЕ СМЕЦЦЕ, А ЎГНАЕННЕ

У мінскіх парках і скверах больш не будуць прыбіраць апалае лісце. Пра гэта паведаміў учора старшыня камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольля Мінгарвыканкама Аляксандр БАРАВІКОЎ. Згодна з новым рашэннем, апалае лісце будуць зграбаць толькі за пяць метраў ад праезнай часткі, каб яно не перашкаджала руху аўтамабіляў і не забівала калодзежы ліўневай каналізацыі. Мяркуецца, што забарона на прыбіранне апалага лісця дапаможа не толькі захаваць экалагічны баланс, але і сэканоміць бюджэтныя сродкі.

Дарэчы, сёлета падобнае рашэнне было прынята ў Маскве, дзе таксама не прыбіраюць апалае лісце ў зялёных зонах. «Трэба разумець, што апалае лісце — гэта частка колазвароту рэчываў, — пракаментаваў **дырэктар установы «Цэнтр экалагічных рашэнняў» Яўген ЛАБАНАЎ**. — Трапляючы ў глебу, яно ўтварае перагной, які служыць выдатным арганічным угнаенне. Аднак у гарадскіх умовах ёсць свае нюансы. Збольшага апалае лісце можа быць забруджана цяжкімі металамі. «Гарадскі» перагной лепш не выкарыстоўваць як кампост для вырошчвання культур, але магчыма прымяніць у якасці дэкаратыўнага сродку. Убіраючы апалае лісце, людзі знішчаюць насякомых. Акрамя таго, апалае лісце стварае паветраную падушку пад снегам, дзе добра захоўваюцца насенне раслін, карані дрэў».

Кацярына РАДЗЮК.

КОНКУРС ВАШЫХ ПРАЕКТАЎ

У Беларусі праводзіцца конкурс праектаў «Месца сустрэчы: дыялог» па аказанні дапамогі былым вязням канцлагераў.

Мэтай конкурсу з'яўляецца падтрымка праектаў некамерцыйных арганізацый, накіраваных на дапамогу і паляпшэнне якасці жыцця ўсіх пацярпелых ад нацыянал-сацыялізму (гэта тычыцца, акрамя былых вязняў канцлагераў і гета, таксама людзей, што прыцягваліся да прымусовай працы, былых ваеннапалонных і г.д.).

Праект можа ўключаць такія кірункі, як арганізацыя валанцёрскай дапамогі, аказанне псіхалагічнай і адукацыйнай падтрымкі, заняткі па інтарэсах, мерапрыемствы па здаровым ладзе жыцця, экскурсіі, наведванне на даму і г.д. Тэрмін рэалізацыі праектаў — да двух гадоў. Фінансаванне кожнага з іх можа скласці ад 5 тыс. да 20 тыс. еўра ў год.

Да ўдзелу ў конкурсе праектаў запрашаюцца некамерцыйныя арганізацыі, у тым ліку дзяржаўныя, муніцыпальныя, грамадскія, рэлігійныя, якія зарэгістраваны і ажыццяўляюць дзейнасць у нашай краіне.

Заяўкі прымаюцца па 1 снежня 2014 года ў цэнтральным офісе МГА «Узаемаразуменне».

Святлана БУСЬКО.

ГРОШЫ — НІШТО, КАЛІ ІМІДЖ «КУЛЬГАЕ»

Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» адмовіліся ад месячнай зарплаты

Такое рашэнне гульцы прынялі на агульнакамандным сабранні пасля пяці паражэнняў запар на старце спаборніцтваў Адзінай лігі ВТБ. Пасля шчырай мужчынскай размовы спартсмены вырашылі добраахвотна адмовіцца ад заробку за кастрычнік, каб дадаткова матываваць сябе да паляпшэння вынікаў на кантынентальнай арэне.

Гэтую сітуацыю пракаменціраваў **капітан «Цмокаў» Аляксей ЛАШКЕВІЧ**: «У нашай камандзе сабраліся вопытныя і амбіцыёзныя спартсмены. Усе яны добра ўсведамляюць, у якім становішчы апынуўся калектыў. Відавочна, што ў пяці стартавых матчах Адзінай лігі ВТБ клуб не паказаў вынікаў, якіх ад яго чакалі. Для паляпшэння сітуацыі патрабаваўся стымул. Найбольш эфектыўным, на погляд усіх гульцоў, з'яўляецца адмова ад месячнай зарплаты. Прыемна, што хлопцы з разуменнем паставіліся да гэтага рашэння і пагадзіліся, што яно неабходна».

Кіраўнікі ж клуба гарантавалі выплаты па кантрактах у поўным аб'ёме ў выпадку адчувальнага росту вынікаў «Цмокаў» як на пляцоўках лігі ВТБ, так і ў матчах Еўрачэленджа.

Адзначым, што ў межах беларускага спорту гэта беспрэцэдэнтны выпадак. А вось заходнія калегі нашых спартсменаў неаднаразова прыбягалі да падобных мер. Так, пасля нядаўняга паражэння «Сандэрленда» ад «Саўтгемптана» ў англійскай прэм'ер-лізе (0:8) футбалісты першай каманды паабяцалі вярнуць грошы за квіткі ўсім фанатам, якія прыехалі падтрымаць сваю каманду больш чым за 500 км.

Ці дапаможа гэта «драконам», хутка даведаемся. Першы паядынак Еўрачэленджа мінчане правядуць ужо заўтра ў гасцях у турэцкага клуба «Ушак».

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

ПРЫЯЦЕЛЬ ЖАНЧЫНЫ-КІРОЎЦЫ ЗБІЎ ПАСАЖЫРАЎ

Вяртаючыся дадому з начнога клуба, 25-гадовы мінчанін з сяброўкай вырашылі скарыстацца паслугамі таксіста-«прыватніка». Якраз такі аўтамабіль, за рулём якога знаходзілася жанчына, яны заўважылі непадалёку. Дамовіўшыся пра кошт паездкі, маладыя людзі селі ў салон і накіраваліся ў пасёлак Сокал. Ведалі б, чым скончыцца гэтая паездка...

— Прыехаўшы па адрасе, кіроўца запатрабавала суму, удвая большую за агавораную да паездкі. Пасажыры ў адказ папрасілі выдаць ім чэк за паслугу, аднак жаданага не атрымалі. Жанчына-кіроўца... заблакіравала дзверы машыны, пазваніла свайму таварышу і накіравалася назад у Мінск. На просьбы пасажыраў выпусціць іх не рэагавала. Не дапамагло нават тое, што малады чалавек разбіў шкло, — паведаміла **прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля ГАНУСЕВІЧ**. — У сталіцы, не выпускаючы пасажыраў, яна сустрэлася з таварышам, які падсеў у машыну. Мужчына таксама ніяк не рэагаваў на словы маладых людзей. Спыніўшыся ў прамзоне, ён пачаў... збіваць пасажыраў. Малады чалавек атрымаў больш за 20 удараў нагамі па галаве. Пры гэтым у яго адабралі больш за 200 тысяч рублёў і пашпарт. Падчас «размовы» пацярпелы сказаў, што дома ў яго ёсць 500 долараў, якія ён гатовы аддаць.

Усе зноў селі ў машыну і вярнуліся ў... Сокал. Падняўшыся ў чужую кватэру, мужчына пачаў пагражаць маладому чалавеку. На шум выйшаў бацька хлопца, які папрасіў агледзець машыну. Пакуль усе трое выходзілі на двор, малады чалавек паспеў выклікаць міліцыю.

У дачыненні да мужчыны заведзена крымінальная справа за злоснае хуліганства. Ён знаходзіцца пад вартай. Дзеянням жанчыны-кіроўцы таксама даецца прававая ацэнка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Будзь у курсе!

КАЛІ ЛАСКА, ПАКІНЬЦЕ РЭЦЭПТ!

Новыя правілы набыцця лекаў у аптэках дзейнічаюць з 19 кастрычніка

Сама ўвесь час пішу аб тым, што для таго, каб паклапаціцца аб сваім здароўі, патрэбна ўсяго… прыйсці ў паліклініку. Вось я прыйшла ў паліклініку, стаю, каб узяць талончык. Што характэрна, нават без усякага папярэдняга запісу мне даюць талончык да ўчастковага тэрапеўта, таму што ў мяне ёсць скаргі на здароўе. Аднак пад дзвярыма да тэрапеўта мне даводзіцца стаяць… сядзець… круціцца… амаль дзве гадзіны! Людзей не так і шмат. Проста адзін дзядуля са сваім немаладым сынам аднялі ў маладога тэрапеўта 50 хвілін! Рэцэпты выпісвалі — іх няцяжка было заўважыць у руках нахабнаватага сына, які правёў свайго хворага сваяка без чаргі…

Што да «вузкіх» спецыялістаў, то да аднаго з іх мне не выпадае трапіць ужо шмат месяцаў! Таму што я ніяк не вылаўлю «дні запісу». А калі вылоўліваю, то спачатку бясконца слухаю кароткія гудкі, затым пару доўгіх і… заканамерны адказ: талоны на наступны месяц ужо скончыліся.

Да чаго я ўсё гэта? Ды вось разважаю: а колькі гадзін давядзецца правесці пад дзвярыма майго тэрапеўта цяпер, калі хранічныя хворыя павінны будуць часцей хадзіць у паліклініку па рэцэпты, калі ўрачам даводзіцца выпісваць ужо нашмат больш гэтых самых рэцэптаў? Бо 19 кастрычніка ў рэцэптурнай галіне з'явіліся пэўныя змяненні і дапаўненні. Грамадскае абмеркаванне гэтых змен праходзіць пакуль выключна з настроем пад знакам «мінус». Народ прыняў ініцыятыву «ў штыкі». Па сутнасці, абурацца маглі б і медыкі, у якіх павялічыцца аб'ём працы. Аднак… медыцынская супольнасць лічыць, што падобныя настроі абывацеляў — неабгрунтаваныя. Вось як тлумачыць сітуацыю **намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Ларыса ДЗЯНІСАВА.**

— У першую чаргу новаўвядзенне павінна наладзіць кантроль за рацыянальным прызначэннем лекавых сродкаў і адпаведнай рэалізацыяй іх праз аптэкі. Усё ж такі размова ідзе пра сур'ёзныя пытанні: якія менавіта лекі выпісваюць урачы, ці даходзіць пацыент да аптэкі, ці набывае тое, што яму прапісана? Па-другое, па-ранейшаму застаецца пералік прэпаратаў, якія адпускаюцца без рэцэпта. Калі хворы аддае перавагу прэпарату нейкай фірмы, то ён мае права набыць гэты прэпарат. Ніхто нікому не забараняе ўжываць тыя лекі, якія ён жадае. Аднак трэба ўлічваць, што льготныя рэцэпты — бясплатныя ці з аплатай 10 працэнтаў ад кошту — гэта іншая рэч. Яны выпісваюцца строга па адпаведных пратаколах. Усе краіны абараняюць свае фармацэўтычныя рынкі, сваіх фармвытворцаў. Мы павінны ісці па тым жа шляху, а не па шляху падтрымкі нейкіх сусветных брэндаў. Тым больш айчынныя прэпараты не менш эфектыўныя, што пацвярджае іх практычнае выкарыстанне. Асабіста я набываю лекі беларускіх вытворцаў. У рэцэпце, дарэчы, будзе прапісана міжнародная, а не фірменная, назва прэпарата.

— У Міністэрстве аховы здароўя «змяненні і дапаўненні» звязваюць з неабходнасцю прадухілення вельмі распаўсюджанай у нашай краіне з'явы — самалячэння. Вы можаце пацвердзіць актуальнасць такой праблемы сёння? Ці шмат пацыентаў схільныя не ўзгадняць сваё лячэнне са спецыялістамі?

— Нават пацыенты, якія пакутуюць ад хранічных захворванняў і працягла прымаюць прызначаныя лекі, маюць патрэбу ў своечасовай карэкцыі лячэння. Мы пастаянна гаворым аб тым, што антыбіётыкі, сардэчна-сасудзістыя прэпараты можна прымаць толькі па прызначэнні ўрача. Але што мы назіраем? Гіпертонік атрымлівае рэцэпт і шмат гадоў не прыходзіць на паўторны прыём. Да такіх лекаў, як знап, знам, якія даволі часта прызначаюцца людзям з артэрыяльнай гіпертаніяй, можа развівацца прывыканне. Прэпараты перастаюць дапамагаць, губляюць эфектыўнасць, і ў чалавека паступова развіваецца ўскладненне — інфаркт, інсульт. Сваякі такога пацыента пасля ківаюць на ўрачоў: маўляў, мы не эфектыўна лечым…

— Паколькі рэцэпты давядзецца пакідаць у аптэцы, людзі будуць вымушаны часцей наведваць паліклініку…

— І выдатна. Наша насельніцтва катэгарычна не любіць займацца прафілактыкай, не любіць лячыцца так, як прызначыў доктар… У нас не рэдкасць — выяўленне захворванняў у запушчанай стадыі. Прадухіліць гэта магла б дыспансерызацыя, але ж мы можам толькі запрасіць на прыём. Наша паліклініка добра ўкамплектавана кадрамі, а таму вы не пабачыце чэргаў каля кабінетаў, дзе здаюць аналізы, робяць электракардыяграму… Вось зараз праходзіць вакцынацыя ад грыпу. Паліклініка прапануе прышчапіцца бясплатна любым катэгорыям насельніцтва, не толькі з груп рызыкі. Але і тут штосьці не відаць чэргаў…

— Цяпер на адным рэцэптурным бланку выпісваецца толькі адзін лекавы сродак…

— Так, калі патрабуецца растваральнік для прэпарата, тады могуць быць выпісаны два найменні.

— Гэта адназначна павялічвае час прыёму аднаго пацыента…

— Ужо ў кожным раёне сталіцы ёсць паліклінікі, якія выпісваюць электронныя рэцэпты. Там наогул няма ніякай розніцы — запоўніць тры або шэсць папер. Паступова на электронны варыянт работы павінны перайсці ўсе паліклінікі. А пакуль не будзем забываць пра тое, што кожны ўрач працуе ў пары: у яго ёсць або памочнік урача, або медсястра. Варта адзначыць, што для тых пацыентаў, якім патрэбна працяглае лячэнне, дазваляецца выпісваць рэцэпт тэрмінам да 6 месяцаў. Пры гэтым можа выпісвацца адначасова некалькі рэцэптаў.

— А калі ў хворага не хапае грошай, каб набыць лекі адразу на ўвесь месяц?..

— Няма ніякай праблемы. Пацыенту ў гэтым выпадку выпішуць столькі рэцэптаў, колькі яму пакажацца мэтазгодным.

— Цяпер урачы маюць права выпісваць прэпараты не толькі на латыні, але і на рускай і беларускай мовах, хоць не існуе ўрачоў, якія не валодаюць лацінню…

— Так, раней выкарыстоўвалася толькі лацінская мова. Можа быць, гэтае новаўвядзенне будзе больш зручным для правізараў і фармацэўтаў.

Святлана БАРЫСЕНКА

Гіпертонік атрымлівае рэцэпт і шмат гадоў не прыходзіць на паўторны прыём. Да такіх лекаў, як знап, знам, якія даволі часта прызначаюцца людзям з артэрыяльнай гіпертаніяй, можа развівацца прывыканне.

БЛІЖЭЙ ДА МАСТАЦТВА

У МІНСКІМ ТРАМВАІ АДБЫЛАСЯ ВЫСТАВА «МЫ» БЕЛАРУСКІХ ФАТОГРАФАЎ СЯРГЕЯ І ДЗМІТРЫЯ БРУШКО

Бацька і сын, два фатографы, якія жылі ў розныя эпохі. Фотаздымкі стужкавай эпохі 80–90-х гадоў XX ст. Сяргея Брушко і лічбавыя каляровыя здымкі Дзмітрыя Брушко, на якіх можна ўбачыць замалёўкі з паўсядзённага жыцця жыхароў гарадоў і вёсак, прымушаюць гледачоў шукаць розніцу паміж мінулым і сучасным.

Цікава, што «МЫ» — гэта своеасаблівы рэмейк легендарнай выставы Сяргея Брушко, якая праходзіла разам з акцыяй газеты «Чырвоная змена» 27 гадоў таму. На жаль, расказаць пра тую выставу могуць толькі яе відавочцы. Малодшы Брушко ўспамінаў, як у шасцігадовым узросце катаўся на тым трамваі, разглядваючы здымкі. Нездарма месцам правядзення выставы быў выбраны трамвай — грамадская прастора, дзе не існуе рамак. На здымках кожны пасажыр можа знайсці сваіх сяброў і нават сябе.

Надзея БУЖАН, фота аўтара.

■ Ведай сваё

ПАЧУЦЬ... СКАРБЫ

БЕЛТЭЛЕРАДЫЁКАМПАНІЯ ВЫПУСЦІЛА ЎНІКАЛЬНЫ МУЗЫЧНЫ ЗБОРНІК

Калекцыя дыскаў пад агульнай назвай «Музычны скарб Беларусі» — гэта арыгінальная аўдыякніга, складзеная са 127 запісаў за 1940–2010 гг. Сюды ўвайшлі самыя розныя пласты музычнай культуры краіны: арыгінальныя апрацоўкі беларускага фальклору ў розных стылях, рэдкія запісы знакамітых музыкантаў і калектываў, малавядомыя інтэрпрэтацыі беларускімі выканаўцамі сусветных хітоў… Гэта серыя, на думку яе стваральнікаў, матэрыяльны доказ уласна існавання, самабытнасці і высокага ўзроўню нацыянальнай беларускай музычнай культуры.

Усе выкарыстаныя запісы, дарэчы, узяты з уласных архіваў — вялізнага фонду Белтэлерадыёкампаніі, які змяшчае найбагацейшую калекцыю аўдыяматэрыялаў (больш за 126 тысяч фанаграм і 3,5 тысячы дыскаў агульнай працягласцю звыш 20 тысяч гадзін гучання) і відэаматэрыялаў (тут, напрыклад, захоўваюцца 68 мастацкіх фільмаў і 273 дакументальныя, знятыя на «Тэлефільме» і нацыянальнай кінастудыі або сумесна, а таксама выпускі тэлевізійных навін за некалькі дзясяткаў гадоў). «Толькі ў нас можна пачуць голас Машэрава і паведамленне Левітана аб вызваленні Мінска, паслухаць развагі Льва Талстога, запісаныя на грамафон»,— прыводзіць прыклады рэдкіх запісаў **намеснік кіраўніка дырэкцыі фондавых матэрыялаў БТРК Ала ВЯРЭНІЧ.**

Захоўваючы ў скарбніцы ўсё гэта эксклюзіўнае багацце, тэлевізіёншчыкі вырашылі не выступаць «сабакам на сене» і падзяліцца ім са слухачамі і гледачамі, прычым як айчыннымі, так і замежнымі. Дзеля гэтага і вырашылі скласці збор музычных сачыненняў — найлепшых з лепшых. Музычным рэдактарам давялося праслухаць літаральна кіламетры фонастужак, выціскаючы «самы сок», які быў бы максімальна цікавым для шырокай публікі. Прызнаюцца: спачатку меркавалі зрабіць адзін двайны дыск, але ў выніку ўсё ледзь змясцілася на шасці. На першы, пад назвай «Зара мая вячэрняя», трапіў беларускі фальклор — знакамітыя песні і танцы ў розных апрацоўках. Другі, «Беларуская сюіта» — гэта музыка вядомых кампазітараў, пачынаючы з XVII стагоддзя да нашых дзён: урыўкі з «Полацкага сшытка», оперы «Дзікае паляванне караля Стаха», паланэз «Развітанне з Радзімай», адажыа з балета «Маленькі прынц»… Вядомыя мелодыі, а таксама сусветныя хіты ў выкананні беларускіх спевакоў і інструменталістаў, увайшлі на трэці і чацвёрты дыскі — «Уздоўж па вуліцы» і «Рапсодыя». Пяты ж, «Праз усю вайну», сабраў песні, мелодыі і інфармацыйныя паведамленні, якія падтрымлівалі баявы дух на фронце і ў тыле ў гады фашысцкай навалы… Нарэшце, шосты, заключны дыск «Неба і зямля», прадстаўляе духоўную музыку Беларусі ў самых папулярных яе ўзорах.

Дарэчы, неўзабаве плануецца яшчэ другое выданне серыі, дапоўненае архіўнымі відэазапісамі і рэдкімі кадрамі з канцэртаў. Аднак у продаж «Музычны скарб Беларусі» не паступіць — прынамсі, у бліжэйшы час. Убачыць і паслухаць выбраную калекцыю можна будзе ***4 лістапада на аднайменным канцэрце ў вялікай зале Белдзяржфілармоніі, а таксама 14 лістапада — у тэлеверсіі на канале «Беларусь 1» і 15 лістапада — у радыёверсіі на Першым канале Беларускага радыё.***

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

■ Спорт-тайм

БАТЭ ўзмацняе пазіцыі

У традыцыйным спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра самы прынцыповы футбольны матч мінулага тыдня, чарговую перамогу мінскіх «зубраў» і паспяховы ваяж у Літву беларускіх гандбалістаў.

1 У мінскага «Дынама» не атрымалася адолець БАТЭ ў чарговым класіка сезона. Барысаўчане ўпэўнена перайгралі «беласініх» — 2:1. У пераможцаў забівалі Анры Хагуш і Дзяніс Палякоў. І толькі на сыходзе апошняй хвіліны дадатковага часу Нікаліч выратаваў сваю каманду ад «сухога» паражэння. Пасля паядынку галоўны

Фота Надзеі БУЖАН.

трэнер «Дынама» Уладзімір ЖУРАВЕЛЬ так апісаў характар гульні: «У цэлым гульня была пад нашым кантролем, але БАТЭ — каманда, якая ўмее выціскаць максімум з нешматлікіх шанцаў. Два галы памянялі працяг паядынку. Не магу сказаць, што мы заслугоўвалі паражэння. Трэба ўспрымаць гэта як чарговае выпрабаванне. У апошніх гульнях хлопцы паказвалі якасны футбол, але ў гэтым матчы не атрымалася».

«Нафтан» з «Шахцёрам» не выявілі пераможцу, згуляўшы ў «сухую» нічыю, а «Тарпеда-БелАЗ» справіўся з «Гомелем» (1:0) і дзякуючы гэтай перамозе выйшаў на чацвёртае месца ў турнірнай табліцы. За тры туры да канца чэмпіянату БАТЭ працягвае лідзіраваць, чатыры ачкі «жоўта-сінім» саступае «Дынама», на трэцяй пазіцыі застаўся салігорскі «Шахцёр».

2 Пасля няўдачы з «Сібір'ю» (1:4) хакейнае «Дынама-Мінск» з такім жа лікам **перайграла новакузнецкі «Металург».** Шайбы на рахунку Аляксандра Кулакова, Ніка Бэйлена, Сяргея Дразда і Дзмітрыя Мялешкі. Тым не менш лепшым гульцом матча самі хакеісты прызналі Канстанціна Захарава, які адзначыўся двума галявымі пасамі.

3 Пасля нічыі з баснійцамі ў матчы кваліфікацыі Еўра-2016 мужчынская зборная Беларусі па гандболе перайграла каманду Літвы — 30:28. Самым карысным гульцом стаў Барыс Пухоўскі, на рахунку якога восем ачкоў. А вось жаночая зборная ў Літве правяла два таварыскія матчы, адзін з якіх выйграла (37:31), другі саступіла (30:33).

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■ Анатомія жыцця

«МНЕ ХАПІЛА 10 ГАДОЎ, КАБ СПІЦЦА»

Непрыдуманыя гісторыі тых, хто змог адмовіцца ад спіртнога

Адны людзі збіраюцца пасля працы, каб выпіць. Іншыя — каб назаўсёды пазбавіцца ад гэтай залежнасці. Каля дзвюх тысяч беларусаў рэгулярна наведваюць групы ананімных алкаголікаў. На сход адной з такіх груп пад выглядам навічка змагла трапіць і я. Як становяцца алкаголікамі і чаму толькі адзінкі з іх вяртаюцца да нармальнага жыцця? Пачуць адказы «пашчасціла» з першых вуснаў.

Страціў працу і палову зубоў

Група АА, да якой я (выключна па рэдакцыйным заданні!) вырашыла далучыцца, збіраецца па некалькі разоў на тыдзень у будынку сталічнага наркадыспансера. Калі я ўвайшла, у кабінеце ўжо сядзелі сем чалавек. Не сінюшныя, акуратна апранутыя — звычайныя людзі, адным словам.

— Вы першы раз прыйшлі? — пытае мяне куратар групы.

— Так.

— Добра, праходзьце. Можаце зняць абутак: традыцыя ў нас такая.

Пакінуўшы боты і паліто каля дзвярэй, займаю свабоднае крэсла. Акрамя мяне, навічкоў больш не было. Усе члены групы ходзяць на сустрэчы пастаянна, некаторыя — ужо па некалькі гадоў. Большасці з іх прыйшлося страціць усё, каб зразумець, што празмерная любоў да гарэлкі — гэта хвароба.

— Добры дзень. Я Дзіма, і я алкаголік,— пачынае сваю гісторыю мужчына ў спартыўным касцюме.— Гарэлку пакаштаваў у старэйшых класах — і мне адразу спадабалася. Збіраўся з сябрамі і напіваўся: проста піць мне было нецікава. Цярпець не мог людзей, якія нальюць сабе па тры чаркі, а потым сядзяць увесь вечар з кіслымі тварамі, размаўляюць. Я любіў «накідацца» па-хуткаму і ўчыніць штосьці. Пабіцца з кім-небудзь, напрыклад. Не заўважыў, як пачаў дэградаваць. Знаёмыя, праўда, казалі, што ў мяне праблемы, але хіба лёгка запэўніць алкаголіка ў тым, што ён хворы? Вось і я не верыў. Думаў, калі захачу кінуць піць — змагу. Але адмаўляцца не хацелася. Наадварот, чакаў таго моманту, калі зноў нап'юся. Падстаў хапала: выхадныя, зарплата ў сябра. У выніку застаўся без працы і здароўя. На чалавека ўвогуле не падобны быў. Я цяпер выглядаю лепш і маладзей, чым пяць гадоў таму. Сабутэльнікі на вуліцы не пазнаюць.

— А мне алкаголь спачатку не падабаўся,— прызнаецца Ігар, мужчына гадоў сарака.— Піў толькі таму, што ўсе вакол так рабілі. Адмовішся — адразу: «Ты што, наркаман?». Перакаштаваў усё: піва, віно, гарэлку, чарніла…

— Ты пакуль расказваў, у мяне аж сліна пацякла,— жартуе Ігараў сусед.

— Піць нармальна не атрымлівалася гады тры, пасля кожнай бяседы мне было вельмі дрэнна. А потым арганізм неяк прызвычаіўся. Мне здавалася, так крута — піць колькі хочаш і не завяршаць вечар побач з унітазам. Але пачалі раздражняць знаёмыя. Калі сядзелі за сталом, хто-небудзь абавязкова казаў: «Ігар, можа, табе хопіць?» Я крыўдзіўся: нармальна ж сябе адчуваю, чаму вунь да таго, хто ўжо на падлозе валяецца, не чапляецца ніхто? Пачаў падманваць. Ішоў у госці — браў з сабой бутэльку, каб незаўважна дзе-небудзь глынуць, а за сталом, калі за табой назіраюць, піць паменей.

У п'яных бойках Ігар страціў палову зубоў. Каб зранку ўстаць з ложка і пачаць хаця б нармальна размаўляць, патрэбны былі сто грамаў. Мужчына ў той час жыў у Маскве і, калі ішоў у краму па гарэлку, браў толькі папяровыя рублі. І каб без рэшты: рукі настолькі трэсліся, што трымаць манеты было немагчыма.

Выйшла замуж і паспяхова спілася

Малады хлопец Косця ўпершыню трапіў у наркалагічны дыспансер, калі яму было 23 (дарэчы, самаму маладому алкаголіку нашай групы толькі 22):

— Медсёстры мне казалі: «Ты ж малады, прыгожы, толькі не пі». Сам ведаў, што трэба спыніцца, але як? Каб спіцца, мне хапіла дзесяці гадоў. Спрабаваў, вядома, кінуць піць самастойна. Цвярозым быў год, а потым сарваўся. Нідзе не працаваў, з бацькамі часта сварыўся. Але, каб не іх падтрымка, піў бы і сёння.

Святлана, што сядзела побач са мной, ніколі не думала, што стане алкагалічкай.

— А ў дзяцінстве ніхто і не марыць стаць алкаголікам,— усміхаюцца мужчыны.

Калі вучылася ў школе, Святлана была сціплай, непрыкметнай дзяўчынай. Сяброў няшмат, закаханых хлопцаў яшчэ меней. Вось і пачала піць, каб стаць смялейшай. Каштавала гарэлку — нават нос затыкала: настолькі непрыемна. Праз некалькі гадоў кампанія Святлане ўжо была не патрэбна — піла ў адзіноце. На апошнім курсе інстытута выйшла замуж. За алкаголіка.

— Замест таго, каб хадзіць на заняткі, мы сядзелі дома і паспяхова співаліся,— успамінае Святлана.— Рыхтавацца да дзяржаўных іспытаў часу не было. Таму ў дзень экзамену я вырашыла прыкінуцца хворай. Выклікала «хуткую» і сказала, што баліць жывот. «Пашанцавала»: у мяне тады сапраўды нейкую праблему знайшлі. Іспыт потым здала. А з мужам больш не жыву.

Лячыцца гатовы не ўсе

Каб пазбавіцца ад залежнасці, ананімныя алкаголікі праходзяць праграму «12 крокаў». Чытаеш — здаецца, нічога складанага. Прызнаешся самому сабе, што ты бяссільны перад алкаголем і страціў кантроль над сваім жыццём. Просіш падтрымкі ў Бога (кожны можа разумець пад гэтам словам нешта сваё). Але толькі адзінкам удаецца прайсці курс да канца.

— Ведаеш, як мой трэнер кажа? Шмат хто хоча навучыцца баксіраваць, але толькі некаторыя гатовы нешта рабіць дзеля гэтага. З алкаголікамі тое ж самае. Мае былыя сабутэльнікі зайздросцяць мне: свой бізнес пачаў, грошы заўсёды маю. А хто вам перашкаджае пайсці працаваць? Я запрасіў аднаго да сябе ў фірму, нармальную зарплату паабяцаў… На чатыры дні хапіла чалавека. І ў групу гэтых сяброў прыводзіў. Ніхто не застаўся. Галоўная ж праблема, яна тут,— паказвае Дзіма на галаву.

— Мала проста прыходзіць на сустрэчы з групай і сядзець, слухаючы суседніх алкаголікаў. Трэба працаваць над сабой кожны дзень — а гэта цяжка. Многія з нас спрабавалі кінуць піць самастойна. Але трэба ведаць, як правільна «завязваць». Калі табе дрэнна — злуешся, нервы напружаны, думаеш, як пратрымацца яшчэ дзень,— выніку не будзе,— тлумачыць Святлана.

На словах маіх новых знаёмых, цвярозасць, па якую яны прыходзяць у ананімныя алкаголікі, насамрэч толькі пабочны эфект. Больш важна тое, што ты вучышся адчуваць сябе шчаслівым і без алкаголю. Тыя, хто змог адмовіцца ад спіртнога, усе роўна працягваюць наведваць групу: дзеляцца досведам з таварышамі, умацоўваюць сваю сілу волі. Калектыўная падтрымка і адказнасць дапамагаюць не піць (нават па святах) і пяць, і дзесяць гадоў.

Пасля афіцыйнага сходу — гарбата і размовы пра жыццё, за якое нарэшце не сорамна.

…А за сцяной памяшкання — зусім іншая гісторыя. Непадалёк наркадыспансера кампанія з некалькіх мужчын ужо паспела «замачыць» вечар пятніцы. Для іх праблема з алкаголем — гэта калі няма, чаго выпіць. У той вечар праблем дакладна не было: адзін з таварышаў трымаў у руце яшчэ не пачатую бутэльку.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ

Сяргей МАЛОЧКА, галоўны ўрач Гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансэра:

— На базе ўсіх буйных філіялаў наркадыспансера працуюць групы ананімных алкаголікаў. Мы заўсёды станоўча ацэньваем іх дзейнасць. Безумоўна, некаторым людзям спачатку патрэбна сур'ёзная медыцынская дапамога. І цалкам вылечыцца ад алкагалізму наўрад ці магчыма. Але сустрэчы ў групах спрыяюць замацоўванню добрага выніку і працяглай рэмісіі. На шчасце, узровень ужывання алкаголю на душу насельніцтва зніжаецца. Хоць п'юць усё роўна шмат. 44 тысячы чалавек назіраліся ў наркадыспансеры летась. Пакуль не скароцім вытворчасць спіртнога і не зробім алкаголь менш даступным, праблема будзе існаваць.

■ Векапомнае

ГЕРОЯМІ БЫЛІ ЎСЕ...

Побач з іншымі абаронцамі Брэсцкай крэпасці і Брэста з фашыстамі змагаліся чачэнцы і інгушы.

Пра гэта часта згадваюць і на экскурсіях па крэпасці, у музеі. Асабліва — у сувязі з іменем Магамета Узуева, якому пасмяротна ў 1996 годзе прысвоена званне Героя Расіі. Магамет Узуеў гераіскі загінуў у першы ж дзень абароны крэпасці... Але быў час, калі чачэнскаму літаратару Халіду Ашаеву даводзілася настойліва даказваць, што Брэст баранілі дзясяткі, сотні яго землякоў. Ён нават спіс склаў — 275 прозвішчаў. І пісьмо напісаў легендарнаму Сяргею Смірнову, аўтару кнігі «Брэсцкая крэпасць», у якім выказаў жаданне падзяліцца сабранай інфармацыяй. Пісьменнік, які і сам узнаўляў праўду па крупінках, чамусьці адказаў суха. Удакладніў пры гэтым, што ўжо загружаны работай над іншай тэмай. Халід Ашаеў працягваў свае пошукі, пісаў аповесць «Брэст — вогненны арэшак». Адзін вядомы маскоўскі літаратар так адрэагаваў на памкненні чачэнскага даследчыка: маўляў, не збіраюся спрыяць тым, «хто расцягвае гісторыю Айчыннай вайны па «нацыянальных кватэрах».

Абышоўшы многія паселішчы, напісаўшы сотні лістоў, Халід Дудаевіч давёў сваю справу да лагічнага завяршэння. Па-першае, склаў дакладны, наколькі гэта ўвогуле магчыма было, спіс абаронцаў з ліку ўраджэнцаў тагачаснай Чачэна-Інгушэціі. Па-другое, запісаў успаміны жывых удзельнікаў абароны. Халід Ашаеў быў вядомым у рэспубліцы чалавекам. Пра яго настойлівасць у збіранні ваенна-гістарычнай памяці шмат хто ведаў. Усе чакалі, калі з'явіцца кніга... Але аповесць чыталі, рэцэнзіравалі не толькі ў выдавецтвах, тэкст разглядаўся літаральна пад мікраскопам — у партыйных і іншых інстанцыях. Здаралася, пісьменніка абнадзейвалі, здаралася, што патрабуючы ад яго пэўных кампрамісаў, абяцалі, што хутка праца будзе выдадзена. Ды толькі...

Вельмі былі моцнымі стэрэатыпы ў дачыненні да народа, які трынаццаць гадоў знаходзіўся ў дэпартацыі. Чачэнцам і інгушам часта нагадвалі і пасля вяртання: «Не забывайцеся, вас не рэабілітавалі, не апраўдалі — вас проста памілавалі». І рашэнні XX з'езда КПСС не сталі законам для мясцовых партакратаў. І як жа яны ў такім выпадку маглі дазволіць агучыць сваю нязгоду Халіду Ашаеву, чалавеку-адзіночку, які выступіў супраць сістэмы!.. Чалавеку, пісьменніку, які ў адказ на абвінавачванні сваіх суайчыннікаў у здрадніцтве, спрыянні фашыстам, доказна, з фактамі ў руках расказваў пра гераізм, мужнасць чачэнцаў, інгушоў, ураджэнцаў свайго краю...



Нягледзячы на забароны і перашкоды, Халід Ашаеў стварыў свой летапіс абароны Брэсцкай крэпасці.

Удзельнікі абароны Брэсцкай крэпасці Сайд-Ахмат Бейцяміраў і Адам Узуеў.

Абапіраючыся на архіўныя даныя, Халід Ашаеў назваў, як на яго погляд, дакладную лічбу чачэнскіх і інгушскіх удзельнікаў Вялікай Айпайшоў шукаць Мані, Магамета, бо не ведаў, што ён скажа бацькам, калі сам выжыве. Баяўся, што яго палічаць баязліўцам, які пакінуў брата ў бядзе.

Асухан Дукаеў, радавы 125-га стралковага палка, абараняўся ад немцаў у адным з адсекаў круглай казармы, якая прымыкала да Трохарачных варот. Тут біліся байцы 455-га стралковага палка. Усё ў агні перамяшалася. Паранены асколкам міны, Асухан патрапіў у палон. За колькі дзён перад гэтым ён напісаў па-чачэнску лацінскімі літарамі на тынку арачнага праходу: «Тут змагаўся і загінуў жыхар сяла Шалі Чачэнска-Інгушскай рэспублікі Асухан Цітрыевіч Дукаеў. Успомніце яго». Але салдат выжыў. Быў у палоне. Паспеў і паваяваць.

...Халід Ашаеў так і не дачакаўся выхаду ў свет аповесці пра Брэст. Памёр пісьменнік у 1977 годзе. Адышла яго душа ад пакут: высылкі, астрогаў, допытаў у КДБ, ад неаднаразовых выключэнняў з партыі, ад пазбаўлення ў многіх правах, найперш — у важным для пісьменніка праве друкавацца. Аповесць жа «Брэст — вогненны арэшак» была ўпершыню надрукавана ў 1990 годзе. У многім гэтаму паспрыяў малады пісьменнік, галоўны рэдактар выдавецтва Іскам Эльсанаў. Да таго выдання былі прыкладзены два спісы абаронцаў Брэста з Чачэна-Інгушскай рэспублікі: Навукова-метадычнага савета брэсцкага комплексу ў 25 чалавек і самога Х. Ашаева ў 240 чалавек. У 2004 годзе сын пісьменніка Майрбек Ашаеў перавыдаў аповесць у першапачатковым аўтарскім варыянце. І прыклаў да яго спіс выяўленых пісьменнікам чачэна-інгушскіх абаронцаў Брэста. Іх — 275. Укладальнік зборніка лічыць і яго няпоўным. У архіве Халіда Ашаева захавалася шмат разрозненых запісаў з новымі імёнамі. Але, відаць, літаратар не спяшаўся рабіць новыя варыянты спіса, пакуль не меў на руках пэўных удакладненняў.

Асобнай гаворкі заслугоўвае тэма захоўвання пісьменніцкага архіва Халіда Ашаева. І матэрыялаў, звязаных з «брэсцкай тэмай» — у прыватнасці. Дзве вайны ў Чачні — «навядзенне канстытуцыйнага парадку» і «антытэрарыстычная аперацыя» — не шкадавалі ні людзей, ні гарадоў і вёсак, ні тым болей папер. Дзеці Халіда Ашаева (а перш наперш — Майрбек Халідавіч) зрабілі ўсё магчымае, каб і архіў захаваць, перанеслі яго праз баявыя дзеянні, бежанства, жыццё ў неспрыяльных умовах. І гэта таксама шмат пра што гаворыць. Як і пра тое, што памяць пра вогненны Брэст, пра Вялікую Айчынную дарагая ўсім народам, чые прашчуры змагаліся з фашыстамі.

Максім ЛАДЫМЕРАЎ

■

■ Сярод іншых на планеце

РЭЙТЫНГ АБАВЯЗВАЕ...

Наша краіна апераджае ўсе дзяржавы СНД па выдатках на ахову здароўя і па пісьменнасці насельніцтва

Даклад аб чалавечым развіцці ў 2014 годзе быў афіцыйна прадстаўлены ў Мінску. Наша краіна ўвайшла ў пяцёрку краін з высокім узроўнем індэкса чалавечага развіцця. Усяго прадстаўнікі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый уключылі ў даклад 187 краін, якія ўвайшлі ў чатыры групы: дзяржавы з вельмі высокім узроўнем чалавечага развіцця, з высокім, сярэднім, а таксама з нізкім узроўнямі. Спіс узначальваюць Нарвегія, Аўстралія і Швейцарыя, завяршаюць — Цэнтральна-Афрыканская Рэспубліка, Дэмакратычная Рэспубліка Конга і Нігер. Беларусь знаходзіцца на 53 пазіцыі.

РАЗВІЦЦЁ — ГЭТА БАРАЦЬБА З НЕАБАРОНЕНАСЦЮ

Прэзентацыю даклада праводзіў **Санака САМАРАСІНХА, пастаянны прадстаўнік Праграмы развіцця ААН у Беларусі**. Ён падкрэсліў, што наша краіна першай сярод дзяржаў былога Савецкага Саюза адкрыла прадстаўніцтва Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Санака Самарасінха звярнуў асаблівую ўвагу на значнасць тых намаганняў, якія робіць наша краіна на міжнароднай арэне ў сферы барацьбы з гандлем людзьмі.

У нашай краіне лепшыя сярод краін СНД паказчыкі барацьбы з дзіцячай смяротнасцю (чатыры выпадкі на 1000 народжаных) і смяротнасцю дзяцей ва ўзросце да 5 гадоў (5 выпадкаў на 1000 народжаных).

Пры падрыхтоўцы сёлетняга даклада аб чалавечым развіцці асаблівую ўвагу распрацоўшчыкі звярнулі на фактар неабароненасці. Нягледзячы на тое, што ў апошнія гады назіраўся прагрэс у галіне скарачэння беднасці, згодна з дакладам, больш за 2,2 мільярда чалавек на планеце жывуць ва ўмовах так званай шматмернай беднасці або вельмі блізка да гэтага стану. Тэрмін шматмернай беднасці падразумявае не толькі абмежаванасць грашовых сродкаў і матэрыяльных нястач, ён таксама ўключае абмежаванні ў магчымасцях атрымліваць адукацыю, доступ да элементарных паслуг аховы здароўя, чыстай пітной вады... Даклад таксама называе прыкладную колькасць людзей, якія зараз пакутуюць ад пастаяннага голаду — гэта 842 мільёны чалавек.

Вельмі часта беднасць парушае нармальны ход развіцця дзіцяці. Так, распрацоўшчыкі сёлетняга даклада звяртаюць увагу на тое, што прыкладна кожнае пятае дзіця ў краінах, якія развіваюцца, жыве ва ўмовах абсалютнай беднасці і недаядае. У тых жа краінах (дзе, дарэчы, жыве 92% ад усіх дзяцей планеты) сямёра дзяцей са ста не жывуць больш за пяць гадоў, нараджэнне пяцідзесяці з гэтай сотні не зарэгістравана, 68 не атрымліваюць адукацыі ў раннім узросце, 17 не паступілі і не паступяць у пачатковую школу, у 30 будзе затрымка росту.

ЁСЦЬ НАД ЧЫМ ПРАЦАВАЦЬ

Вядома, усё гэта не пра нас. Гаворачы пра нашу краіну, Санака Самарасінха падкрэсліў, што яна даволі паспяхова рэалізуе свае сацыяльныя праграмы, робіць шмат для таго, каб людзям тут жылося камфотна.

— Беларусь займае адну з самых высокіх пазіцый у свеце з пункту гледжання барацьбы з няроўнасцю. У той жа час мы павінны памятаць, што ў Беларусі жыве прыкладна паўмільёна інвалідаў, — нагадаў прадстаўнік ААН. — Для краіны з дзесяцімільённым насельніцтвам гэта шмат. Але ж дзе гэтыя людзі? Як правіла, ім нязручна выходзіць на вуліцу. Напрыклад, мой офіс не прыстасаваны для інвалідаў-калясачнікаў і для людзей-інвалідаў па зроку. Таму трэба паступова працаваць і над тым, каб гэтым людзям было камфортна жыць і развівацца ў грамадстве.

Больш за 2,2 мільярда чалавек на планеце жывуць ва ўмовах так званай шматмернай беднасці або вельмі блізка да гэтага стану.

Праграма развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у нашай краіне цесна супрацоўнічае з міністэрствамі эканомікі і замежных спраў — сумесна рэалізуецца 29 праектаў. Як заўважыў падчас прэзентацыі даклада **Мікалай СНАПКОЎ, міністр эканомікі**, нам ёсць чым пахваліцца: з 2009 года мы падняліся на 15 пазіцый у рэйтынгу індэкса чалавечага развіцця.

У ЧЫМ МЫ ЛЕПШЫЯ

Як адзначыў у сваім выступленні **Валянцін РЫБАКОЎ, намеснік міністра замежных спраў нашай краіны**, з года ў год пры падрыхтоўцы такіх дакументаў мяняецца сістэма назапашвання і апрацоўкі, аналізу статыстычнай інфармацыі. Абсалютна непазбежна для кожнай краіны як магчымае павышэнне, так і падзенне.

— Мы дзякуем аўтарам даклада за тое, што цяпер мы маем фактычны матэрыял, з якім будзем працаваць, — заявіў прадстаўнік МЗС.

Ён звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што ў дакладзе змяшчаецца шэраг статыстычных паказчыкаў, якія прама не уплываюць на вызначэнне рэйтынгу. У той жа час яны даюць багатую дадатковую інфармацыю для параўнальнага аналізу якасці жыцця насельніцтва ў дзяржавах — членах ААН. Напрыклад, выдаткі Беларусі на адукацыю складаюць 5,25% ВУП, на ахову здароўя — 5,32%. Па гэтых паказчыках мы апераджаем усе краіны СНД, уключаючы Расійскую Федэрацыю і Казахстан.

У нашай краіне лепшыя сярод дзяржаў — удзельніц СНД паказчыкі барацьбы з дзіцячай смяротнасцю (чатыры выпадкі на 1000 народжаных) і смяротнасцю дзяцей ва ўзросце да 5 гадоў (5 выпадкаў на 1000 народжаных). Па гэтых паказчыках мы апярэджваем не проста краіны рэгіёна і краіны СНД, а ўвогуле займаем адно з лідзіруючых месцаў у свеце. Апераджае Беларусь і ўсе краіны СНД па такім паказчыку, як пісьменнасць дарослага насельніцтва.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

Беларусь — Чарнагорыя: блізкія перспектывы

З рабочай паездкай у Падгорыцы (Чарнагорыя) пабываў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Сербіі і ў Чарнагорыі (па сумяшчальніцтве) Уладзімір Чушаў. Прайшлі сустрэчы беларускага дыпламата з прэзідэнтам Чарнагорыі Філіпам Вуянавічам, кіраўніцтвам парламента краіны, Міністэрствам замежных спраў і еўрапейскай інтэграцыі.

У размове з прэзідэнтам былі абмеркаваны пытанні развіцця беларуска-чарнагорскага супрацоўніцтва ў розных галінах. Мяркуецца, што ў бліжэйшай перспектыве бакі арганізуюць правядзенне бізнес-форуму гандлёва-прамысловых палат дзвюх краін. Уладзімір Чушаў перадаў намесніку старшыні Скупшчыны Чарнагорыі запрашэнне наведаць Беларусь для чарнагорскай парламенцкай дэлегацыі на чале са спікерам парламента Ранка Крывакапічам. На сустрэчы прагучала ініцыятыва стварэння дэпутацкіх груп дружбы ў парламентах Беларусі і Чарнагорыі.

Мікола БЕРЛЕЖ

■

ІНВЕСТАРЫ ЗБЯРУЦЦА Ў МАГІЛЁВЕ

З 4 па 7 лістапада абласны цэнтр прыме ўдзельнікаў двух міжнародных форумаў — дзясятага беларуска-літоўскага і сёмага «Магілёўская вобласць — шлях да поспеху».

«Мерапрыемствы пройдуць практычна паралельна, — адзначыў **старшыня камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Руслан СТРАХАР**. — Свой удзел у іх пацвердзілі прэм'ер-міністры Беларусі і Літвы. Гэта сведчыць пра асаблівую значнасць мерапрыемстваў і прызнанне заслуг Магілёўскай вобласці ў развіцці і прыцягненні інвестыцый».

Што датычыцца традыцыйнага магілёўскага форуму, які праходзіць раз на два гады, чакаецца, што ў ім будуць удзельнічаць прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі, Італіі, Ізраіля, Польшчы, Сербіі, Фінляндыі, Ірландыі, краін Прыбалтыкі, Швецыі, Турцыі і іншых. Яны прымуць удзел у рабоце 4 секцый па напрамках: СЭЗ «Магілёў» — «Ад Балтыкі да Ціхага акіяна», прамысловы сектар і вытворчасць будматэрыялаў, харчовая галіна і сельгасвытворчасць, а таксама развіццё спорту і турызму. У рамках форуму будзе працаваць выстава-кірмаш.

Як адзначаюць арганізатары, удзел у гэтых мерапрыемствах дасць магчымасць патэнцыйным інвестарам арганізаваць прыбытковае прадпрыемства на тэрыторыі вобласці і перарабляць каштоўныя выкапні рэгіёна — фасфарыты, цэментную сыравіну, будаўнічыя і сілікатныя пяскі, торф, прэсныя і мінеральныя воды. На Магілёўшчыне таксама існуюць добрыя ўмовы для будаўніцтва ветрапаркаў, жывёлагадоўчых комплексаў, усталявання сонечных батарэй, рэалізацыі праектаў па смецціперапрацоўцы і іншых.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

■ Дапамога

ЁСЦЬ ДОМ, ПРАЦА І СПАКОЙ — А БОЛЬШ НІЧОГА І НЕ ТРЭБА

Маладая сям'я з Данецкай вобласці пераехала ў беларускую глыбінку, каб застацца тут назаўсёды

Настасся і Сяргей Дубіны, іх сын Глеб, якому ў лістападзе споўніцца 3 гады, жывуць у «прэзідэнцкім доміку» ў аграгарадку Адаменкі Лёзненскага раёна. Пра тое, што ў Беларусі бясплатна прадстаўляюць катэджы работнікам сельскагаспадарчых арганізацый, маладая жанчына даведалася па інтэрнэце.

Яна працуе галоўным эканамістам у ААТ «Адаменкі», муж — кіроўца грузавіка, а паралельна вучыцца на курсах трактарыстаў. Глебка ходзіць у садок.

— Па нацыянальнасці і я, і муж — украінцы. Мы жылі ў невялікім гарадку Дзімітраў, я скончыла там філіял Кіеўскага ўніверсітэта. Муж ва Украіне працаваў шахцёрам. Думкі пра тое, што трэба з'ехаць з Украіны, з'явіліся яшчэ да сумна вядомых падзей, — распавядае Наста. Часам падчас гутаркі яна пераходзіць на ўкраінскую мову, а па-руску гаворыць з характэрным акцэнтам.

Канчаткова яны зразумелі, што трэба ехаць, калі мужу ўсё больш небяспечна стала праязджаць блокпасты (ён ездзіў на сваім аўто ў іншы гарадок на працу ў шахту).

— Калегі мужа ехалі на аўтобусе міма блокпаста, і той аўтобус быў абстраляны. Я баялася яшчэ, што мужа прымусяць ваяваць... А калі шчыра, нам да гэтага часу складана зразумець нюансы палітычнага жыцця ва Украіне. Навошта ваяваць, чаму нельга мірна дамаўляцца? Простым людзям цяжка ў гэтым разабрацца, — працягвае мая суразмоўца.

Яе брат жыве ў Данецку. Пасля таго, як атрымаў асколачнае раненне, быў шпіталізаваны. (Дарэчы, у бальніцах Данецкай вобласці медыкі робяць літаральна цуды, нягледзячы на недахоп медыкаментаў і затрымкі з выплатай зарплаты.) Муж працаваў у шахце, не шкадуючы сіл, — часам у дзве змены. Адпаведна і зарабляў добра — па ўкраінскіх мерках. У пераразліку на беларускія рублі прыкладна 10 мільёнаў за месяц выходзіла. «Але жыццё даражэйшае!» — кажа Наста.

Менавіта Віцебскую вобласць муж і жонка Дубіны выбралі, улічваючы некалькі абставін. У Віцебску жыве далёкая сваячка Насты Эла Залатнікова. Яна, дарэчы, вельмі дапамагла перад пераездам: аб'ездзіла гаспадаркі, дзе магчыма было ўладкавацца на працу, агледзела жыллё, высветліла ўсе нюансы ў беларускай пашпартна-візавай службе. Потым яшчэ і мэблю падарыла перасяленцам. Па-другое, у Беларусі блізка да мяжы з Украінай ўжо складана знайсці працу ўкраінцам. А яшчэ Віцебшчына прывабіла тым, што тут параўнальна добрае экалагічнае становішча. Праўда, прызналася, клімат для ўкраінцаў халаднаваты.

У Расію сям'я не хацела ехаць, хоць там і заробкі большыя. У нашай краіне, на думку Насты, няхай і меншы дастатак, але больш парадку і стабільнасці.

Працай жанчына задаволеная (да яе пасаду галоўнага эканаміста займала маладая жанчына, якая пайшла ў дэкрэтны водпуск.) Сяргей хацеў бы зноў працаваць шахцёрам, але ў Віцебскай вобласці, як вядома, няма шахтаў. Бабуля Насты нядаўна таксама пасялілася разам з імі і дапамагае выхоўваць Глеба. Малы, дарэчы, успамінае Украіну. Часам пытаецца, калі можна будзе вярнуцца. А вось мама Насты жыве ў Ізраілі — у прынцыпе, сям'я магла б і туды пераехаць.

— Але тут мы жывём у асобным утульным доме з трыма пакоямі, і з усімі выгодамі. І праца ў нас ёсць. Навошта ж шукаць, дзе яшчэ лепш. Ды і клімат у Ізраілі вельмі спякотны. А яшчэ... Я, калі гасцявала ў мамы і яе мужа, бачыла шмат людзей на вуліцы ў форме і са зброяй у руках, у любы момант можа адбыцца тэракт. Пасля падзей ва Украіне я перш за ўсё цаню мір і спакой. Галоўнае для мяне — упэўненасць у тым, што я, муж, дзіця, бабуля, выйшаўшы на вуліцу, вернемся дадому жывымі і здаровымі, — разважае жанчына.

Сям'я падала пакет дакументаў, каб афарміць пасведчанне на права жыхарства ў Беларусі. Бежанцамі яны сябе не лічаць. Ніякую матэрыяльную дапамогу не прасілі — ні ў райвыканкаме, ні ў гаспадарцы. Па выхадных муж і жонка часцей за ўсё ўладкоўваюць дом. З суседзямі яшчэ не настолькі добра пазнаёміліся, каб адзін да аднаго хадзіць у госці.

На развітанне Настасся падзялілася «сакрэтам», што ва Украіне гатавала пад заказ тарты. Таму не выключана, што з часам яна паспрабуе ў Беларусі пачаць займацца «салодкім бізнесам». Тым больш што Віцебск недалёка, можна будзе і туды вазіць сваю прадукцыю. Праўда, кажа, для выпечкі тартоў патрэбна добрая печ.

Мы дамовіліся сустрэцца яшчэ раз — праз некаторы час. Калі выйшаў на вуліцу з будынка канторы ААТ «Адаменкі», убачыў двух мужчын, якія пацікавіліся ў мяне, «дзе тут начальства». Высветлілася, яны таксама з Украіны...

Аляксандр ПУКШАНСКІ, *Лёзненскі раён*

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ

Аукцион состоится 08.12.2014 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049.

№ лота	Наименование объекта, его местонахождение, арендуемая площадь, кв.м	Начальная цена продажи, руб.	Сумма задатка, руб.	Характеристика объекта	Условия аукциона		Коэффициент к базовой ставке арендной платы
1	Право заключения договора аренды капитального строения с инвентарным номером 350/С-73317 (здание магазина), площадью 275 м², расположенного по адресу: г. Гомель, станция «Центролит». Срок договора аренды – 3 года	7 012 500	500 000	Одноэтажное кирпичное здание со встроенной котельной; торговая площадь – 180 м²	1	для производства и (или) реализации товаров (продукции), размещения складских и офисных помещений, выполнения работ и оказания услуг	2,5
					2	для оказания бытовых услуг населению (понижающий коэффициент, учитывающий вид деятельности – 0,4)	2,5

Продавец (арендодатель): **«Гомельская дистанция гражданских сооружений» РУП «Гомельское отделение Белорусской железной дороги», 246034, г. Гомель, ул. Хозяйственная, 19, тел. (0232) 95 55 69.**

Организатор торгов: **Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Региональное инвестиционное агентство «ГомельИнвест», г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67, тел. (0232) 25 49 00, факс 25 49 01.**

Документы на участие в аукционе принимаются **с 10.11.2014 г. по 05.12.2014 г.** в рабочее время (с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00), по адресу: **г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67.** Документы, поданные **после 17.00 05.12.2014 г.,** не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона **(08.12.2014 г.)** с 10.00 до 11.00 по адресу: **г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67.**

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на р/с 3012113129041 в Региональной Дирекции № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель платежа – ГП «РИА «ГомельИнвест», УНП 490779270. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 08 декабря 2014 г.

При подаче заявления участник должен иметь:

1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе (в случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть);

2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность;

индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона;

представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и доверенность;

представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию приказа, протокола о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона;

представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из государственного реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей – подписания протокола о результатах аукциона; оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды; возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; заключения договора аренды: Участник аукциона, ставший победителем аукциона (единственным участником аукциона), уплачивает штраф в размере 15% от начальной цены продажи Объекта.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона уплачивает штраф в размере 15% от начальной цены продажи Объекта.

Телефон для справок (0232) 25 49 00, факс 25 49 01.

■ Фінансы

«НЕЛЬГА ЧАКАЦЬ, ПАКУЛЬ НАША ЭКАНОМІКА СТРАЦІЦЬ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦЬ...»

Плата за эквайрынг — зноў вышэйшая за тарыф на інкасацыю. Ранейшую пастанову Нацбанк адмяніў

Гэтае рашэнне карэспандэнту «Звязды» падчас выставы «Банк. Страхаванне. Лізінг» пракаментаваў намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргей ДУБКОЎ.

Нагадаем, што пастановай № 599 было рэкамендавана банкам прадугледзець устанаўленне платы за аказанне паслуг па інкасацыі наяўных грашовых сродкаў у памеры не ніжэй чым 10 рублёў за 1000 рублёў, за аказанне паслуг па эквайрынгу (банкаўскі сэрвіс, які дазваляе арганізацыям гандлю і сэрвісу прымаць для аплаты банкаўскія плацежныя карткі. — **Аўт.**) па аперацыях з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак — у памеры не ніжэй за 0,8% ад сумы аперацыі. Акрамя таго, банкам рэкамендавалася спаганяць плату ў памеры не ніжэй за 1% ад сумы аперацыі за прыём праз свае касы наяўных грашовых сродкаў ад продажу тавараў, выканання работ, аказання паслуг. Цяпер жа гэтая норма адменена — тарыфы на інкасацыю і эквайрынг змяняцца не будуць. І вышэйзгаданае рашэнне ўступае ў сілу з моманту яго прыняцця.

«Мы сутыкнуліся з непрыняццем гэтага падыходу, — заявіў Сяргей Дубкоў. — З прычыны таго, што простыя задачы па развіцці безнаяўных разлікаў мы ўжо вырашылі. У той жа час мы маем сумесны план урада і Нацыянальнага банка, які ўзгоднены з усімі ўдзельнікамі — банкамі, прадпрымальніцкімі аб'яднаннямі, міжнароднымі арганізацыямі, органамі дзяржкіравання. Многае з яго ўжо выканана. Напрыклад, паглядзіце, які прагрэс мы маем з плацежнай сістэмай Белкарт, якая раней была на правах беднага сваяка, а цяпер займае ганаровае месца сярод плацежных сістэм. Было прынята рашэнне, што плацежныя тэрміналы павінны быць практычна ў кожным суб'екце гаспадарання. І шмат чаго іншага. А ў плане ёсць пытанні, якія цяпер трэба вырашаць. Скажам, з выплатай заработнай платы на картку. Мы разам з банкамі прааналізавалі звесткі, і атрымалася, што толькі 28,1% пералічваюць грашовыя сродкі на банкаўскую плацежную картку ў межах зарплатных праектаў. 14% кліентаў прымяняюць змешаную форму. Выплаты з наяўных, якія паступілі ў касу, — 57,9%. Атрымліваецца, што 2/3 эканомікі выплачвае зарплату наяўнымі. Як тады будуць развівацца безнаяўныя разлікі? Людзі не пойдуць сабе самі рабіць карткі».

Аднак чаму эканоміцы выгадна карыстацца наяўнымі сродкамі? «Інкасацыя і эквайрынг маюць пэўныя тарыфы. Інкасацыя праводзіцца ледзь не па нулявых тарыфах. Але ж не бывае аперацый без выдаткаў. Значыць, ідзе перакрыжаванае субсідзіраванне. За кошт чаго? За эквайрынг, працэнтную стаўку. А значыць, ніякія нашы прапановы не будуць успрымацца, таму што больш выгадна карыстацца наяўнымі. І мы паспрабавалі змяніць сітуацыю. Асноўная задача была не ў тым, каб даць банкам зарабіць, а паказаць рэальныя выдаткі наяўна-грашовага абарачэння. Тое, што ніхто не захацеў рабіць гэта прымусова, я разумею. Але ж пагадзіцеся, што нельга чакаць, пакуль наша эканоміка згубіць канкурэнтаздольнасць, бо аналагічныя дзеянні праводзяцца нашымі асноўнымі партнёрамі і канкурэнтамі, у тым ліку ў межах АЭП», — патлумачыў намеснік старшыні Нацбанка і даў зразумець, што да гэтага пытання яшчэ будуць вяртацца.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

Фота Надзеі БУЖАН.

ДАРЭЧЫ

На 9-й спецыялізаванай выставе фінансавых паслуг «Банк. Страхаванне. Лізінг», якая прайшла ў Мінску, адбылося ўзнагароджанне пераможцаў III Рэспубліканскага конкурсу «Журналісты — за фінансавую адукаванасць». Сярод пераможцаў аказаўся і рэдактар аддзела эканомікі нашай газеты Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, якога Нацыянальны банк прызнаў «самым фінансава адукаваным журналістам».

На фота: намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргей ДУБКОЎ (злева) узнагародзіў нашага журналіста.

■ Клімат-кантроль

ШПАРГАЛКІ ДЛЯ ЭКАНОМНЫХ,

альбо Хто падкажа, як паменшыць рахункі за энергаспажыванне?

Летась у Мінску пачаў працаваць першы ў краіне Грамадскі кансультацыйны цэнтр па пытаннях энергазберажэння і аднаўляльнай энергетыкі. Па словах кансультанта па рэсурса- і энергазберажэнні Цэнтра экалагічных рашэнняў (ЦЭР) Антона ГАХОВІЧА, самыя папулярныя пытанні ад насельніцтва, з якімі даводзіцца працаваць, — гэта ўцяпленне дома, аднаўляльныя крыніцы энергіі, выкарыстанне энергазберагальных і светадыёдных лямпачак. За год кансультацыі спецыялістаў атрымалі больш за тры тысячы чалавек. Антон Гаховіч адзначыў, што за час работы кансультацыйнага цэнтра былі падрыхтаваны спецыяльныя брашуры-«сцэнарыі» па ўладкаванні асвятлення, сонечных батарэй, зберажэнні вады, уцяпленні дома. Ёсць у спецыялістаў і ўнікальны ў сваім родзе стэнд «Цёплыя сцены», на якім можна самастойна, падбіраючы розныя матэрыялы, вызначыцца, чым лепш уцяпляць сцены. Такім чынам, попыт на паслугі энергакансультантаў у Беларусі ёсць, таму ў перспектыве ўстанова будзе развівацца далей: бліжэйшым часам плануецца павялічыць штат супрацоўнікаў цэнтра.

ЯК ГЭТА — ЭКАНОМІЦЬ ЭКАЛАГІЧНА?

Дарэчы, беларускі кансультацыйны цэнтр зроблены на шведскі ўзор. Вядома, беларускія кансультанты, як і іх шведскія калегі, не займаюцца прасоўваннем канкрэтных брэндаў, а распавядаюць пра ўвесь існуючы асартымент энергазберагальных тэхналогій. Напрыклад, яны прапануюць замяняць грувасткія стацыянарныя камп'ютары на лёгкія і мабільныя нэтбопы. Замест спажывання 100 Вт энергіі за гадзіну тыя «з'ядаюць» усяго толькі 8 Вт: так можна сэканоміць да 80 долараў за год. Дарэчы, у хуткім часе ў рамках праекта «Прасоўванне энергазберагальных тэхналогій і аднаўляльных крыніц энергіі на мясцовым узроўні» заменяць камп'ютары ў некаторых установах Пухавіцкага раёна.

Наступны крок — гэта замена асвятлення, як вулічнага, так і хатняга. Хаця энергазберагальнымі лямпачкамі ўжо нікога не здзівіш, трэба рухацца да больш эканомнага светадыёднага асвятлення. Прадаўцы гэтага тавару запэўніваюць: за адну лямпачку давядзецца аддаць ад 60 да 100 і больш тысяч, затое яна праслужыць вам дзесяць гадоў. Таксама беларусам варта задумацца над выкарыстаннем саломы ў якасці паліва. «Мы падлічылі, што ў Браслаўскім раёне застаецца больш за 10 тысяч тон нявыкарыстанай саломы — гэта ж колькі біяпаліва прападае», — адзначыў кіраўнік энергетычнай праграмы ЦЭР Дзмітрый БУРОНКІН. Атрымліваецца, што інструментаў для павышэння энергаэфектыўнасці многа, і іх трэба ўключаць у гарадское планаванне.

АД ЛАКАЛЬНАГА — ДА ГЛАБАЛЬНАГА

Чаму ўзнікаюць такія ініцыятывы, падобныя да грамадскага цэнтра па энергакансультаванні? Нагадаем, што дакладна вядома, калі скончацца нафта і газ, а таму падумаць пра энергазберажэнне трэба ўжо сёння. Палітыка Еўрасаюза па пытаннях энергазберажэння даволі жорсткая: да 2020 на 20% у суадносінах з 2010 годам павінны скараціцца спажыванне энергіі і зменшыцца выкіды CO_2, а выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі мусіць павысіцца на 20%. Але што цікава: лёс гэтых лічбаў у большай ступені залежыць ад насельніцтва і мясцовых улад. Многія еўрапейскія гарады ўжо далучыліся да ініцыятывы «пагадненне мэраў» — бяруць на сябе добраахвотныя абавязацельствы па выкананні вышэйпералічаных патрабаванняў. Беларусь не

адстае: далучыліся да «пагадненне» ўжо 10 гарадоў. Аднак і нам ёсць куды рухацца далей. Напрыклад, задае пазітыўны тон сталіца Данii. Капенгаген хоча стаць кліматычна нейтральным горадам да 2025 года. Гэта значыць, доля выкідаў парніковых газаў у горадзе будзе нулявой. Дасягнуць такога паказчыка можна, калі перавесці энергетычную сістэму на аднаўляльныя крыніцы энергіі, вырашыць транспартнае пытанне. Дарэчы, сярод беларускіх гарадоў вялікія шанцы стаць кліматычна нейтральнымі маюць Браслаў і Мар'іна Горка: у іх ужо распрацаваны доўгатэрміновыя энергаэфектыўныя планы, якія ў хуткім часе пачнуць ажыццяўляцца. Але пачынаць можна і са звычайных жыхароў. Элементарнае пытанне «Як плаціць менш за электраэнергію?» можа змясціць стаўленне чалавека да глабальнай праблемы.

Кацярына РАДЗЮК

■

■ Станоўчы вопыт

ЭКС-ДАРМАЕДУ — 10 МІЛЬЁНАЎ!

НА ВІЦЕБШЧЫНЕ ВЕДАЮЦЬ, ЯК ПЕРАВЫХОЎВАЦЬ

Няма сумненняў у тым, што з дармаедамі, якія афіцыйна не працуюць, асабліва цырымоніцца не будуць. Калі ты не інвалід — працуй! Калі працуеш падпольна, легалізуйся і плаці падаткі. А як жа яшчэ? Нікому і нічога не павінен, буду піць і гуляць — за кошт свайго ці яшчэ нейкім чынам? Пры гэтым дайце мне бясплатную медыцыну, ахоўвайце мяне ад злодзеяў і іншае? Не, так справы не пойдуць!

Вядома, будзе зроблены акцэнт на тое, каб такія «асабліва адораныя» грамадзяне па добрай волі пажадалі працаваць. А як іх зацікавіць?

На Віцебшчыне ўжо выпрацавана «методыка», якая можа быць прыменена ў дачыненні да дармаедаў. Улада, у прыватнасці, мае добры вопыт перавыхавання бацькоў, якія павінны кампенсаваць дзяржаве выдаткі на ўтрыманне дзяцей. Такіх нядобрасумленных мам і татаў у свой час таксама называлі гультаямі. На жаль, не ўсе з іх «змянілі тытул». Але тыя, хто зразумелі, што даражэй за дзяцей няма нічога на свеце, пажадалі кардынальна змяніць лад жыцця, не шкадуюць. Некаторым можна нават пазайздросціць.

— Усе абавязаныя асобы, якія, згодна з патрабаваннямі прэзідэнцкага Дэкрэта №18, павінны кампенсаваць дзяржаве выдаткі, працуюць. А ўсяго з пачатку рэалізацыі адпаведнага дэкрэта, прынятага восенню 2006 года, уладкавалі на працу больш за 7,1 тысячы чалавек. Сёлета — 420. Сёння 35% з ліку абавязаных павінны ў месяц кампенсаваць 1,5-2 мільёны рублёў, 15% — звыш 3 мільёнаў... Большасць зарабляе штомесяц 2-2,5 мільёна. Пры гэтым ёсць прыклады, калі ў разы больш, — расказвае «Звяздзе» **Ірына МАТВЕЕВА, намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама.**

Пачуўшы пра заробак 10 мільёнаў рублёў у месяц, падумаў, што адказная асоба памылілася. А дзе так плацяць і за што?

Аказваецца, чалавек столькі зарабіў нават не сёлета, а летась. Ён збіраў садавіну для патрэб перапрацоўчага прадпрыемства, куды яго ўладкавалі.

— Ёсць нямала прыкладаў, калі на Віцебшчыне стымулююць абавязаных асоб змяніць лад жыцця. Напрыклад, на адным прыватным прадпрыемстве практыкуюцца індывідуальныя захады матэрыяльнага стымулявання — за высокія дасягненні ў працы. Там аказваецца і грашовая дапамога — у сувязі з чарговай датай заснавання фірмы, таксама ўручаюць падарункі да дзяржаўных святаў. Сярэдні заробак — 5 мільёнаў рублёў за месяц. У Наваполацкім прадпрыемстве, якое аказвае камунальныя паслугі насельніцтву, працуюць пяць абавязаных чалавек. Іх дзецям перадаюцца навагоднія падарункі, збіраюць канцылярскія прылады перад школай. Абавязаныя прайшлі прафесійнае навучанне без адрыву ад вытворчасці... І як вынік — яны аднаўляюцца ў бацькоўскіх правах, — працягвае мая суразмоўца.

Дык толькі працуй і завязвай з віном і гарэлкай?

— На жаль, у Віцебску мала абавязаных людзей, якія хочуць ісці на больш аплатную працу. Напрыклад, зарабляюць каля 1,8 мільёна рублёў, а пры нармальным стаўленні да працы зарплата склала б 3 мільёны. Прыкладна палова асоб павінны кампенсаваць выдаткі на ўтрыманне дваіх і больш дзяцей. А ўсяго ў Віцебску 613 абавязаных, і прыкладна 70% з іх — адзінокія мамы ва ўзросце да 35 гадоў, — расказвае **Уладзімір ШЛОМА, намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама.**

— Працоўныя калектывы адыгрываюць важную ролю ў павышэнні адказнасці абавязаных асоб, фарміраванні здаровага ладу жыцця, павінны спрыяць аднаўленню ў бацькоўскіх правах. Уладкаваныя на прадпрыемствы і арганізацыі павінны адчуваць, што няма іншага выйсця, акрамя як добрасумленна працаваць. І абавязаныя павінны зразумець, што ў любым выпадку будуць кампенсаваць грошы за выхаванне сваіх дзяцей, — канстатаваў **Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама.**

Прагульшчыкаў прымушаюць адпрацоўваць, тых, хто ўжо не можа жыць без гарэлкі, адпраўляюць у ЛПП, уцекачоў шукаюць. Добрых прыкладаў, калі бацькоў аднаўляюць у правах на выхаванне дзяцей, штогод становіцца ўсё больш.

Вопыт арганізацыі працы з гультаямі і дармаедамі на Віцебшчыне і Беларусі ў цэлым вывучаецца ў Расіі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

■ Факт

АЎТАМАБІЛЬНЫ ЛІЗІНГ БУДЗЕ

А з жыллём яшчэ трэба пачакаць

«Мы лічым, што лізінг аўтамабіляў для фізічных асоб у Беларусі можа пачаць працаваць ужо ў наступным годзе, бо ў першым квартале плануем завяршыць фарміраванне адпаведнага заканадаўчага поля. Прычым гаворка ідзе пра лізінг не толькі новых, але і былых ва ўжытку аўтамабіляў», — паведаміў Сяргей Дубкоў.

Нагадаем, што Нацыянальны банк два гады праводзіў мерапрыемствы, каб стаць рэгулятарам лізінгавай дзейнасці. «У выніку мы ім сталі і пачалі разбірацца ў метадалогіі. Аказалася, што трэба ўнесці змены і ў Грамадзянскі, і ў Падатковы кодэксы, у пастановы Савета Міністраў і міністэрстваў, падрыхтаваць нарматыўна-прававыя акты. Без гэтага лізінг не запрацуе. Мы цяпер гэтым пытаннем займаемся, прычым займаемся досыць паспяхова», — сказаў Сяргей Дубкоў.

Дарэчы, наконт лізінгу жылля Сяргей Дубкоў адзначыў, што над гэтым актыўна працуюць, але па нерухомасці шмат дадатковага заканадаўства. «Цяпер мы гэтыя пытанні разглядаем, і я думаю, што будзем вымушаны выйсці на падрыхтоўку сур'ёзнага нарматыўнага дакумента, таму што пакуль не сфарміравана заканадаўчае поле», — канстатаваў намеснік старшыні праўлення Нацбанка. Таксама, паводле яго слоў, для таго, каб лізінг жылля запрацаваў без шкоды для ўсіх яго ўдзельнікаў, неабходна напрацаваць прававыкарыстальную практыку.

■ Сем «я» — сям'я

«ПАЛОВА ЎЗНАГАРОДЫ НАЛЕЖЫЦЬ МУЖУ!» — лічыць Таццяна Радчанка, якой уручылі ордэн Маці

У сям'і 33-гадовай Кацярыны і Валянціна Радчанкаў з вёскі Равякі, што ў Маладзечанскім раёне, чатыры хлопчыкі і дзяўчынка. У кожнага з іх надзвычай прыгожае і рэдкае імя: Давід, Якаў, Яфрэм, Мія, Савелій. І назвалі бацькі сваіх дзяцей зусім не дзеля таго, каб яны вылучаліся сярод сваіх равеснікаў.

— Кожнае імя нясе пэўную эмацыянальную нагрузку, сэнс, уплывае на жыццё чалавека, — лічыць Кацярына Сяргееўна. — Мы з мужам імкнуліся даць дзецям імёны з добрым значэннем. Мія ў перакладзе з японскай азначае «бласлаўёная мая дзяўчынка» або «ціхая, як храм». Яфрэм — «пладавіты» ці «паслухмяны», Давід — «бласлаўёны мой чалавек», «чалавек, бласлаўёны Богам».

— Ці заўважаеце, што імёны ўплываюць на характар малых? — цікаўлюся ў Кацярыны.

— Нейкія рысы ўсё ж праяўляюцца. Але яны, можна сказаць, пакуль у першапачатковым стане. Я, напрыклад, ужо ведаю, з якімі цяжкасцямі сутыкнуцца мае дзеці. І калі нам нешта не падабаецца ў іх паводзінах, прывычках, імкнёмся іх карэкціраваць. Многае ў выхаванні, станаўленні ўсё ж залежыць ад бацькоў.

«ВУЧУСЯ НА... ДЗЕЦЯХ»

Быць шматдзетнай маці — вялікая праца і адказнасць, але і бязмежная радасць, — сцвярджае мая суразмоўца. Напрыклад, калі кожнае дзіця нясе табе з лесу па слоіку суніц...

— Кожны папросіць: мама, з'еш! І абавязкова пракантралюе, бо ведае, што магу забегацца і проста забыць пра пачастунак, — усміхаецца Кацярына Сяргееўна.

Дзеці бачаць і разумеюць, што бацькам нялёгка, таму стараюцца падтрымаць, дапамагчы. Здараецца, што і не даробяць нешта па гаспадарцы: дзеці ёсць дзеці. Ды як толькі мама паўшчувае: маўляў, я стамілася, а вы лянуецеся, — адразу ж кідаюцца давесці справу да канца. Бывае, што і паспрачаюцца паміж сабой, павалтузяцца, але ў цэлым браты і сястрычка дружныя і ўвесь вольны час праводзяць разам.

Вельмі збліжаюць і сумесныя святы. У адзін з трох дзён — пятніцу, суботу або нядзелю — Радчанкі ладзяць сямейныя вечары, калі разам гатуюць піцу ды і іншыя стравы.

Кожны з дзяцей, можна сказаць, асоба, талент. Старэйшаму Давіду даспадобы архітэктурная лепка. Хлопец лепіць разнастайныя замкі і караблі. А яшчэ ён іграе на фартэпіяна. Праўда, напачатку яму было цяжка, нават хацеў кінуць, але побач была мама, якая натхняла, дапамагала. З цягам часу захапіўся музыкай і цяпер вельмі рады, што ў свой час не адмовіўся ад заняткаў.

Яша захапляецца канструяваннем тэхнікі, усё марыць, як будзе прадаваць машыны. «Будучы бізнесмен расце, — жартуе маці. — Гэта, на маю думку, добрыя задаткі. Разам з тым імкнёмся накіраваць яго, каб здольнасці не перараслі ў імкненне толькі да нажывы. Яфрэм іграе на скрыпцы, добра малюе і лепіць. Міі таксама падабаецца маляваць, а яшчэ танцаваць, спяваць, іграць на фартэп'яна. Паглядзім, што возьме верх».

Наогул, перавага не ў тым, маеш ты «круты» мабільнік ці не. Можна сцвярджацца, рэалізоўвацца ў іншым: вучобе, працы над сабой, самаразвіцці.

Савелій яшчэ маленькі, але займаецца спортам і таксама валодае нядрэннымі мастацкімі здольнасцямі. Але яны, на думку бацькоў, павінны сумяшчацца з чымсьці, так бы мовіць, прыземленым. Хлопчык — будучы мужчына, бацька. Таму вельмі важна, каб ён мог забяспечыць дабрабыт сваёй сям'і. Ды і наогул ужо цяпер бацькі задумваюцца аб тым, каб дзеці не проста паступілі «хоць куды». Вельмі важна, каб яны атрымалі адукацыю, прафесію, якія дапамагалі б у жыцці.

Кацярына Сяргееўна па спецыяльнасці псіхолаг. Ці дапамагае гэта ёй у выхаванні дзяцей? Бясспрэчна. «Без элементарных ведаў дзіцячай псіхалогіі было б больш памылак і праблем, — прызналася яна. — А так імкнешся іх своечасова выправіць. Не ўсё атрымліваецца так, як хочацца. Быць добрай мамай вучуся на сваіх дзецях. Дзякуй Богу, што маю магчымасць быць дома. Калі б працавала з раніцы да вечара, то такога б моцнага ўплыву на іх не мела, як не мела б і глыбокага разумення іх унутранага свету».

ПА АСАБЛІВЫМ ПРАЕКЦЕ

У вёску Равякі сям'я Радчанкаў пераехала з Сёмкава, што пад Мінскам. На такое рашэнне паўплывалі шмат якія фактары: цяпер непадалёку Чысцінская школа з моцнай матэрыяльнай базай, дзе дзеці атрымліваюць добрую адукацыю. Але перш за ўсё змяніць месца жыхарства прымусіў клопат пра здароўе малых. Хацелася, каб яны дыхалі чыстым паветрам, спажывалі натуральныя прадукты, а таксама вучыліся працаваць на зямлі, былі фізічна вынослівымі, загартаванымі. У кожнага з іх цяпер ёсць свае абавязкі: пояць цялят, парадкуюць дровы на зіму, полюць агарод.

Шматдзетнай сям'і выдзелілі ўчастак пад будаўніцтва. Дом яны ўзвялі не абы-які — па асаблівым экалагічным праекце, утульны і цёплы. А побач, праз дарогу, пабудавала дом і сястра Кацярыны — Дар'я. Новыя гаспадары знайшлі агульную мову з мясцовымі жыхарамі, большасць з якіх пенсіянеры. У неперспектыўнай вёсцы зазвінелі дзіцячыя галасы.

Чатыры гады таму Радчанкі зарэгістравалі сялянскую фермерскую гаспадарку, атрымалі звыш 7 гектараў зямлі. Валянцін Мікалаевіч і Кацярына Сяргееўна не маюць сельскагаспадарчай адукацыі, таму даводзіцца вучыцца на сваіх памылках. Разводзілі авечак, курэй, перапёлак, свіней... Але ўрэшце спыніліся на буйной рагатай жывёле: зразумелі, што гэта больш выгадна. Ды і малочную прадукцыю сёння лягчэй рэалізаваць. Лішкі малака сям'я прадае, але няшмат. Штодзень дзеці выпіваюць 6 літраў. Бацькі ж разумеюць, што трэба пашыраць, развіваць гаспадарку далей, але на гэта патрэбны грошы, і не малыя. Вось набылі трактар, прычапны інвентар для цюкавання сена, для пасадкі бульбы. Ды акрамя гэтага шмат чаго яшчэ трэба прыдбаць. Грошы даводзіцца збіраць паступова, адкладваць, бо спадзяюцца Радчанкі толькі на сябе і свае сілы. Разам з тым бацькі не эканомяць на дзецях, іх адукацыі, інтэлектуальным і духоўным развіцці. Калі кагосьці трэба падцягнуць у вучобе, шукаюць рэпетытара. Не шкадуюць грошай і на добрую літаратуру, дапаможнікі.

НА АДНОЙ МОВЕ

У шматдзетнай сям'і насамрэч шмат пераваг перад той, што мае адно дзіця: тут дзеці больш стрыманыя, цярплівыя, разумеюць, што не ўсё і адразу ім дадуць па першым патрабаванні.

Дзецям Радчанкаў таксама хочацца мець сучасныя сотавыя тэлефоны і айфоны, як у аднакласнікаў. Але Кацярына Сяргееўна лічыць: рана яшчэ.

— Пакуль можна абысціся, бо няма вострай патрэбы. Я ж адвожу іх у школу на машыне і забіраю назад. Ды наогул, перавага не ў тым, маеш ты «круты» мабільнік ці не. Можна сцвярджацца, рэалізоўвацца ў іншым: вучобе, працы над сабой, самаразвіцці, — лічыць яна.

Фота Аляксандра ПЛОТКІ.

Таццяна Радчанка з дзецьмі.

Разуменне гэтага, бясспрэчна, прыходзіць з цягам часу, з узростам. Вось і старэйшы Давід жартуе, што на яго адназначна звернуць увагу, бо... такога просценькага тэлефона ніхто ўжо не мае.

Валянцін Мікалаевіч і Таццяна Сяргееўна разам ужо 15 гадоў. За гэты час дасягнулі многага, але самае галоўнае для іх — дзеці, з якімі яны размаўляюць на адной мове, радуюцца разам кожнай прыемнай падзеі. А нядаўна Таццяну Радчанку ўзнагародзілі ордэнам Маці. Як лічыць Таццяна, палова ўзнагароды належыць мужу. Ён, як сапраўдны мужчына, адказвае за вялікую сям'ю, забяспечвае яе дабрабыт. Менавіта дзякуючы яму жонка можа столькі ўвагі аддаваць дзецям.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

■ Родныя тапонімы

На вашы пытанні адказвае старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ

Палонка, Руда-Яварская, Капці

Я даўно марыў даведацца гісторыю паходжання назваў вёсак, у якіх пажыў і папрацаваў за свае 83 гады. Я настаўнік матэматыкі, выкладаў у розных вясковых школах Беларусі. Цяпер, выйшаўшы на пенсію, стаў збіраць матэрыялы пра гэтыя вёскі.

Прашу надрукаваць у «Звяздзе» гістарычныя звесткі пра вёску Палонка былога Навамышанскага, а цяпер Баранавіцкага раёна. Дарэчы, у 2011 годзе пабачыла свет кніга пад назвай «Вёска Палонка і наваколле» накладам у 150 асобнікаў — яны хутка разышліся, таму праз год кніга пра вёсачку была перавыдадзеная.

У 1959–1965 гадах я працаваў у вёсцы Руда-Яварская (пра яе таксама планую выдаць кнігу) і Капці Дзятлаўскага раёна. Даведацца штосьці пра паходжанне іх назваў таксама было б вельмі цікава.

Газету «Звязда» я выпісваю даўно, і чытаю ўсе нумары. Таму буду чакаць адказу.

Аляксей ШЧАРБАЦЭВІЧ.

Наш чытач робіць надзвычай патрэбную і высакародную справу: стварае своеасаблівы летапіс беларускіх паселішчаў, з якімі ў розныя перыяды жыцця звязаў яго лёс. Упэўнены, што матэрыял, сабраны на мясцовасці, самы каштоўны і аб'ектыўны. Ён унясе значны ўклад у стварэнне гісторыка-культурнага зводу «Беларуская тапанімія». Кожная з названых у лісце вёсак мае сваю гісторыю, у кожнай назвы адметнае паходжанне.

Вёска Палонка. Сяло *Палонка* ў старабеларускіх пісьмовых помніках упершыню згадваецца ў пачатку XVI стагоддзя як уладанне Сапегаў. Шмат гістарычных, часам лёсавызначальных, падзей звязана з гэтым месцам. Так, у 1506 годзе ў ваколіцах паселішча Палонка войскі на чале з гетманамі Міхаілам Глінскім і Станіславам Кішкам разгромілі татар. Пазней, падчас Трынаццацігадовай вайны (1654–1667), 28 чэрвеня 1660 года, на гэтым месцы адбылася вялікая бітва, у выніку якой аб'яднаныя сілы Рэчы Паспалітай пад камандаваннем гетманаў Паўла Сапегі і Стэфана Чарнецкага ўшчэнт разбілі маскоўскае войска на чале з ваяводамі Змеевым, Нашчокіным, Трубяцкім, Хаванскім і Шчарбатавым. Пры гэтым расійскія сілы пераўзыходзілі (46 тысяч) больш як у тры разы (15 тысяч) войска ВКЛ.

Копаць у некаторых беларускіх гаворках — гэта сажа, куродым. Верагодна, такую мянушку далі заснавальніку роду па асаблівасцях яго знешняга выгляду.

Важнай падзеяй у грамадскім духоўным жыцці вёскі было заснаванне ў 1680 годзе дамініканскага кляштара, які праіснаваў у Палонцы 150 гадоў, у пачатку XX стагоддзя тут была пабудавана драўляная царква. З 2-й паловы XX стагоддзя *Палонка* стала своеасаблівым адукацыйным цэнтрам: у вёсцы дзейнічалі дзве яўрэйскія школы, а таксама царкоўна-прыходскія школы і папячыцельствы, а ў пачатку XX стагоддзя было адкрыта народнае вучылішча.

Не абмінулі вёску бокам рэвалюцыйныя і ваенныя падзеі XX стагоддзя. Такім чынам, гісторыя гэтай вёскі заслугоўвае таго, каб быць ушанаванай у кнізе. Спадзяюся, што новае выданне адкрые чытачам шматлікія невядомыя старонкі з жыцця легендарнага паселішча.

Назва вёскі *Палонка* паходзіць ад геаграфічнага тэрміна. У сучаснай беларускай мове палонкай называецца незамерзлы або расталы ўчастак ледзяной паверхні ракі або возера. Сустракаецца геаграфічны тэрмін *палонка* і ў народных гаворках беларусаў. Так, на паўночным усходзе і ўсходзе Беларусі *палонкай* называюць частку возера, дзе выходзяць падземныя воды. На тэрыторыі Цэнтральнага і Заходняга Палесся мясцовыя жыхары ўжываюць слова *палонь* для абазначэння чыстага, адкрытага месца без лесу і хмызняку, свабоднага для пашы або касьбы. Паказальна, што слова *палоня* сустракаецца ў большасці славянскіх моў: у польскай мове яно абазначае лужок у лесе; у чэшскай — раўніну; пласкагор'е; пляцоўку ў гарах; у славенскай — альпійскі луг, пашу, у сербскай і харвацкай — вялікую паляну ў лесе. Тапонім *Палонка* і аднакаранёвыя назвы *Паланечка, Паланіца, Паланная, Палонск* сустракаюцца на тэрыторыі Свіслацкага і Карэліцкага раёнаў Гродзенскай вобласці, у Крычаўскім раёне Магілёўскай вобласці і Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці. Аднайменныя назвы населеных пунктаў і мікрааб'ектаў шырока распаўсюджаны і за межамі Беларусі.

Вядомы географ В. Жучкевіч дапускаў сувязь назвы *палонка* з паняццем *палон* і выказваў гіпотэзу, што так маглі называцца паселішчы палонных татараў у XVI стагоддзі. Аднак, на нашу думку, гэтую версію нельга лічыць праўдападобнай.

Вёска Руда-Яварская. На карце Беларусі паселішчы з назвай *Руда* сустракаюцца ў розных рэгіёнах краіны: Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці, Мёрскі раён Віцебскай вобласці, Навагрудскі, Слонімскі раёны Гродзенскай вобласці. На Гродзеншчыне азначаюцца тры састаўныя найменні, у склад якіх уваходзіць кампанент *Руда: Ліпічанская Руда* (Мастоўскі раён), *Яварская Руда* (Дзятлаўскі раён), *Новая Руда* (Гродзенскі раён). Амаль на ўсёй тэрыторыі нашай краіны засведчаны назвы дробных геаграфічных аб'ектаў, утвораныя ад слова *руда*. Рудой называецца паляна ў лесе (Ляхавіцкі раён Брэсцкай вобласці), урочышча (Браслаўскі раён Віцебскай вобласці, Валожынскі раён Мінскай вобласці). Вельмі шмат аднакаранёвых найменняў адзначаецца ў розных раёнах краіны: *Рудавінка* (лес), *Рудаель* (сенажаць каля рэчкі), *Рудая Лужа* (паша), *Рудзіца* (балота), *Рудзьма* (сенажаць), *Рудовіна* (лес) і іншыя. Найбольш верагодна, што ўсе гэтыя найменні прама або ўскосна паказваюць на месцы, дзе залягае прыродная мінеральная сыравіна — *руда*. Рудой у мясцовых гаворках называюць таксама балотную ваду чырвона-белага колеру, якая з'яўляецца сведчаннем залежаў жалезнай руды. Назву *Руда* часам атрымлівалі і рэчкі, якія выцякалі з балот з «іржавай» вадой. Азначальны кампанент *Яварская* ўтвораны ад назвы паселішча *Явар*.

Вёска Капці. У аснову назвы вёскі пакладзена назва калектыву, дадзеная па мянушцы заснавальніка роду або першапасяленца. Паходзіць гэта найменне ад імя-мянушкі *Копаць*. *Копаць* у некаторых беларускіх гаворках — гэта сажа, куродым. Верагодна, такую мянушку далі заснавальніку роду па асаблівасцях яго знешняга выгляду. Прозвішча *Копаць* нярэдка сустракаецца ў сучаснай іменаслоўнай сістэме беларусаў.

***P.S.* Шаноўныя чытачы! Вас цікавіць, што азначае назва горада, вёскі ці мястэчка, у якіх вы жывяце? А можа, той мясцовасці, адкуль вы родам? Вам хочацца ведаць, адкуль пайшлі найменні пэўных урочышчаў, лясоў, азёр, што размяшчаюцца ў вашай мясцовасці? Тады дасылайце свае лісты з пытаннямі на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага 10 а, газета «Звязда» або на электронную пошту igumenski@mail.ru, з пазнакай «Ігуменскі тракт. Родныя тапонімы».**

КАЛЯДНЫ НАСТРОЙ

Як выглядаў тэатр у канцы XIX стагоддзя

Часам можна трапіць у машыну часу. І перанесціся на месца тых гістарычных падзей, якія хацелася б убачыць. Гэта ўдалося ажыццявіць тым, хто днямі завітаў у Нацыянальны акадэмічны тэатр Янкі Купалы. Там мы змаглі ўбачыць спектакль «Сфінкс», якім гэты тэатр адкрываўся ў далёкім 1890 годзе.

ВА ЎСІМ ВІНАВАТЫ «СФІНКС»

Калі падлічыць, то «Сфінксу» на айчыннай сцэне ўжо 124 гады, як і самому тэатру, які, дарэчы, заснаваў знакаміты гарадскі галава Ян Караль Чапскі. Ён жа калісьці выкупіў піўны бровар, што цяпер называецца «Аліварыя» і святкуе 150-годдзе. Свой юбілей прадпрыемства адзначыла пастаноўкай спектакля «Сфінкс», шыкоўным фуршэтам для ўсіх (!) гледачоў, а таксама выхадам новага гатунку піва «Аліварыя Каляднае», якое зрабілі ў абмежаванай святочнай серыі. Зразумела, і новае піва госці змаглі прадэгуставаць — вярталіся дадому ну вельмі вясёлымі і задаволенымі!..

Фота Аліны БЫЛІНЫ.

Спектаклем «Сфінкс» у далёкім 1890 годзе адкрываўся Купалаўскі тэатр.

Але для тых, хто любіць не толькі піва, або не піва, а ўласна тэатр, гэты вечар быў таксама добрым. «Сфінкса» напісаў калісьці французскі драматург, паслядоўнік Жорж Санд Актаў Фельеж. У п'есе прадстаўлена модная ў тыя часы тэма ракавых жанчын. Лепшая сяброўка галоўнай гераіні, яе амаль «старэйшая сястра», закахалася ў яе мужа. Муж, як высветлілася, таксама яе кахае. Сцэна прызнання паміж імі адбылася акурат у прысутнасці маладой жонкі… Развязка адбываецца пры дапамозе «сфінкса» — яду ў пярсцёнку ракавой жанчыны, атрыманага ёй ад аднаго са шматлікіх прыхільнікаў.

Можа, і не такі актуальны для нашых часоў гэты сюжэт. Але… дзе купалаўцы, там свята. Прыемна было назіраць за ігрой акцёраў, за тым напалам жарсцяў, якія віравалі на сцэне.

ЯК ПАН РАПАПОРТ КРЭДЫТОРА ПЕРАХІТРЫЎ

Госці, якія прыйшлі на гэты вечар, змаглі даведацца, што тэатр канца XIX стагоддзя — гэта не толькі драматычныя п'есы. Акурат побач з Купалаўскім (на той час Мінскім гарадскім тэатрам), на рагу вуліцы Юр'еўскай, калісьці знаходзіліся тэатр-вар'етэ і рэстаран для заможных мінчукоў. Там можна было не толькі пачаставацца рознымі далікатэсамі, але і ўбачыць самыя неверагодныя музычныя і тэатральныя нумары. Калі прыгадаць, то ў той час 52% жыхароў сталіцы складалі яўрэі, таму іх культура стала неад'емнай часткай культуры Беларусі на доўгія гады.

Акцёры Купалаўскага тэатра паказалі гледачам яшчэ і шмонцэс — (яўрэйскі анекдот) пад назвай «Містыка фінансаў». Ролі выконвалі народныя артысты Беларусі Сяргей Журавель і Віктар Манаеў. Дзея, якую надзвычай удала разыгралі акцёры, адбывалася паміж яўрэямігандлярамі. Рапапорт быў вінен Гіршу 800 злотых, і той прыйшоў патрабаваць пазыку. Гутарка, якая адбылася паміж хітрымі гандлярамі, аказалася надзвычай дасціпнай. Адзін звярнуўся да другога: «Пане Рапапорце, 800 злотых — гэта не тая сума, якую можна не аддаваць. Можна не аддаваць 10 злотых. Калі зусім бессаромны, можна не аддаваць 20 злотых. Аднак кожная пазыка, большая за 100 злотых, робіцца справай гонару! Пан гэта павінен разумець, бо пан гандляр». Аднак высветлілася, што даўжніка голымі рукамі не возьмеш, ён адказаў: «У мяне іншы погляд на гэту справу. Для мяне 800 злотых — тая сума, якую аддаваць нельга. Ну можна аддаць 10 злотых. Калі быць надта легкадумным, можна аддаць 20 злотых. Аднак доўг, большы за 100 злотых, робіцца проста фікцыяй! Пан павінен гэта разумець, бо пан гандляр». Крэдытор усё ж вырашыў не здавацца і паспрабаваў прыкінуцца беднай авечкай: «Пан павінен мне аддаць, бо я сам вінен Гутману. А яго «душыць» Ройтман. Ройтман таксама не можа чакаць, бо ён вінен Рабіновічу». Рапапорт хацеў было пачаць пярэчыць, але тут да яго дайшло: «Рабіновіч чакаць не можа, бо ён вінен мне! А я чакаць не буду. Вы ж самі хочаце, каб я вам хутчэй аддаў пазыку. Я пазычыў Рабіновічу, ён — Гутману. Гутман — Ройтману, Ройтман — вам. А вы пазычылі мне. І ніхто гэтыя грошы не патраціў?! І ні ў кога іх няма?! Дзе мае 800 злотых?! Гэта і ёсць містыка фінансаў». Далей даўжнік пачаў разважаць пра тое, што менавіта так узнік сусветны фінансавы крызіс: «Амерыка пазычыла Англіі, Англія — Германіі, Германія — Францыі, Францыя — Італіі, Італія — Швейцарыі, Швейцарыя — Англіі, Англія — Амерыцы». «Дык у каго ж грошы?!» — у роспачы выкрыкнуў крэдытор. «Натуральна выходзіць, што ў нас, — спакойна адказаў Рапапорт. — Бо мы нікому не пазычалі. І нам ніхто не пазычаў». Нічога не заставалася рабіць Гіршу, як толькі дадаць: «Я ведаю адзін выхад… Праз дзверы дадому». З іранічнай усмешкай гаспадар дадаў: «Ну вось, вы зразумелі сітуацыю. Няхай пан зноў прыходзіць нагадаць пра грошы, яшчэ пагаворым».

ХТО РАЗГАДАЕ ХАРЛАНЧУКА?..

Аднак і на гэтай вясёлай ноце тэатральны вечар не скончыўся. Гледачам паведамілі, што ў тэатры-вар'етэ калісьці штодня іграў струнны аркестр з 15 музыкантаў (аркестр, хоць і не такі вялікі, іграў і цяпер). Выступалі тады таксама цыганскі хор, танцавальная група і куплетысты. Праграма выступленняў змянялася кожныя 5 дзён — відаць, сапраўды любілі тагачасныя мінчукі павесяліцца.

У наш жа час у ролі аднаго з такіх «элеганцкіх» выканаўцаў выступіў акцёр Павал Харланчук з нумарам «Крыжаванка». Павал проста чытаў пад музыку яшчэ адну не толькі вясёлую, але і павучальную гісторыю. Але як ён рухаўся! Апрануты ў паласаты касцюм, стыльны саламяны капялюш ды з палачкай у руках — ён быў сапраўдным тагачасным франтам. Рухі гэтага акцёра проста заваражылі, узялі ў палон усіх гледачоў. Іначай як талентам ад Бога і прафесіяналізмам тое, што ён рабіў, не назавеш.

Дзею гэтага вечара чакаў далейшы, арыгінальны і вясёлы працяг. На сцэну выйшлі бравыя хлопцы з куфлямі піва. Яны так бадзёра і гучна спявалі, што сарвалі бурныя авацыі залы. Следам за імі на сцэну выйшлі… дзве «казы»! Пару хвілін неразумення — і прысутным патлумачылі, што новы гатунак піва называецца «Каляднае». Усе з палёгкай і радасцю ўсміхнуліся: «Ну трэба ж было такое прыдумаць…»

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Даўней, як толькі міналі Дзяды, адразу ж надыходзіла пара вяселляў. Аддаўшы даніну павагі нябожчыкам-продкам, трэба было паклапаціцца аб працягу роду. Стварэнне новай сям'і было не толькі асабістай справай маладых і іх сем'яў, але і сапраўдным святам для ўсёй супольнасці.

А якое ж свята без піва? Гарэлка, якой так шмат увагі надаецца на сучасных вяселлях, пачала выцясняць піва толькі з XVII стагоддзя. Самыя старажытныя беларускія песні згадваюць менавіта піва, а не гарэлку ва ўсіх традыцыйных святах і абрадах. У гадавым сельскагаспадарчым цыкле больш за ўсё піва варылі ўвосень, і тады ж гулялі большасць вяселляў. Каротка адпачынак паміж летнімі і зімовымі клопатамі, час найбольшага дабрабыту супадаў таксама і з перапынкам паміж пастамі. Так што і з практычнага, і з сакральнага пункту гледжання восень была самым зручным часам і для вяселля, і для піваварства. Гадавы пік і таго, і другога ў праваслаўных прыпадаў на дзень святога Дзмітрыя (Змітра) — 26 кастрычніка, паводле новага стылю — 8 лістапада. На гэтую тэму захавалася нямала беларускіх прымавак:

Святы Змітры — людзі хітры: чаны параць, піва вараць, сыноў жэняць, дачок даюць.

У Змітроў дзень і верабей пад кустом піва варыць.

ЗМІТРОЎСКАЕ ПІВА

Але справа не толькі ў тым, што піва было абавязковым атрыбутам вясельнай бяседы. Мабыць, сам працэс піваварства сімвалічна супастаўляўся з вяселлем, шлюбам, са святым саюзам двух супрацьлеглых і канкуруючых, але ўзаемна неабходных пачаткаў — Соладу і Хмелю. Солад (і само збожжа, піва наогул, піўная бочка) — у народным фальклоры і традыцыйнай вобразнасці выступаюць увасабленнем жаночага — салодкага! — пачатку ў піве. Ды і ў жыцці наогул. Строга кажучы, у піве можна было б абысціся і адным соладам — таксама атрымалася б піва.

Саладкавае было б, як назойлівая матчына ласка… Але ўсё роўна п'яніла б, насычала, наталяла смагу. І усё ж у ім бы чагосьці бракавала… Кажуць: *д'ябал солад саладзіў, ды бабе не дагадзіў…* Урэшце чалавек здагадаўся, што ў піве бракуе горычы (а таксама антыбактэрыяльнай устойлівасці, як высветлілі нашмат пазней, — хоць, магчыма, продкі інтуітыўна здагадваліся і пра гэта, толькі не ўмелі выказаць навукова). Сёння большасць гатункаў піва немагчымая без хмелю, які чыста па-мужчынску ўвесь час кудысьці лезе і чапляецца. Чулі, напрыклад, такую прымаўку — *каб на хмель не мароз, дык бы тын перарос?* Або загадку: *«Быў такі Радзівон, радзіў дзяцей адзін ён. Пайшлі дзеці да Бога, Бога не даталі, вушы паспускалі»*.

Паводле адной з гіпотэз, менавіта славяне першымі здагадаліся выкарыстаць хмель у піваварстве, а германцы навучыліся гэтаму ўжо ў нашых продкаў. Але агульным стандартам дабаўленне хмелю ў піва ў Еўропе стала толькі ў XVI стагоддзі. Тады хмель быў адным з прыкметных артыкулаў экспарту з ВКЛ на Захад, хмельнікі былі ў кожным паважным маёнтку. Пазней гэтая галіна ў нас прыйшла ў заняпад, але ў канцы XIX стагоддзя, калі пачало развівацца новае прамысловае піваварства, адрадзілася зноў: Менская губерня займала ганаровае 3-е месца ў Расійскай імперыі па зборы хмелю. Потым — зноў заняпад і зноў параўнальны ўздым у познесавецкія часы. Але ў сярэдзіне 1980-х гадоў, падчас антыалкагольнай кампаніі, большасць беларускіх хмельнікаў былі занядбаны. Зрэшты, уся сістэма вобразаў і сэнсаў, звязаных з гэтай таямнічай высакароднай раслінай, сучаснаму беларусу, бадай што, ужо незразумелая.

Маладую дзяўчыну ў песнях і загадках жартаўліва параўноўвалі з бочкай піва, якая нудзіцца ў піўніцы, прагнучы вылiцца і наталіць смагу:

Сакатала бочачка,
У піўніцы стоячы:
— Калі мяне не вып'еце,
Я сама разліюся
Па дварэ расіцаю,
За вароты крыніцаю.
Гаварыла дочачка
Сваёй роднай мамачцы:
— Калі мяне не аддасцё,
Я ад вас сама пайду
Па двары мяцёлкаю,
Да мілога пчолкаю,
Па двары расіцаю,
Да мілога сініцаю.

А цяжар бацькі нявесты, змушанага несці шмат клопатаў і выдаткаў на арганізацыю вяселля, асабліва на пасаг, іранічна падсумоўвалі: *«Аддай дочку ды яшчэ піва бочку»*. А ці ведаеце такую загадку? *Паненачка сік-сік, а панічык тык-тык?* Правільна, гэта піўная бочка і шпунт-затычка.

Так што, калі маладых на вяселлі абсыпаюць хмелем і збожжам, зычачы агульнага шчасця і дабрабыту, гучаць у тым ліку і такія старадаўнія прымаўкі:

— Адным вам возам па піва ехаць!

— Трактуйце адно аднаго не так піўцом, як добрым слаўцом.

І нават такое: *«Каб разам да Абрама на піва трапілі»*. Як пажаданне маладым памерці ў адзін дзень.

Шкада, што ані нашы прамыслоўцы-півавары, ані арганізатары вяселляў (таксама ўжо сапраўдная індустрыя) пра ўвесь гэты старажытны сімвалізм ужо і не здагадваюцца…

■ Імёны Бацькаўшчыны

«НАРОД, ЯКІ АБУДЖАЕЦЦА, НЕ ПАТРАБУЕ НЯНЕК»

ВАНДАЛІН ШУКЕВІЧ — ЗАСНАВАЛЬНІК БЕЛАРУСКАЙ АРХЕАЛОГІІ

Знаны археолаг, этнограф і грамадскі дзеяч Вандалін Шукевіч нарадзіўся ў 1852 годзе ў маёнтку каля вёскі Нача на Лідчыне. У гэты час зусім недалёка ад Начы, у маёнтку Шаўры, яшчэ працаваў вялікі гісторык гістарычнай Літвы Тэадор Нарбут. Верагодна, само паветра гэтых мясцін — сэрца старадаўняй Літвы — нарадзіла ў абодвух даследчыках вялікае замілаванне да гісторыі роднага краю, якое вылілася ў шматгадовую апантаную даследчыцкую працу.

«Навуковых інтарэсаў мужа не разумела»

Вандалін нарадзіўся ў сям'і адваката Аляксандра Шукевіча і Аліны Воўк-Карачэўскай. Маёнтак Нача ў Лідскім павеце з'яўляўся маёмасцю маці будучага гісторыка. Менавіта мясцовасць вакол роднай Начы ўсё жыццё вывучаў археолаг Вандалін Шукевіч.

Пасля нараджэння Вандаліна бацькі развяліся, і ўвесь цяжар выхавання лёг на маці і бабулю. Яны былі добра адукаванымі і, разам з тым, глыбока верующымі жанчынамі. Менавіта маці і бабуля фарміравалі характар будучага вучонага і займаліся яго адукацыяй. У маёнтку была добрая бібліятэка з цікавымі кнігамі, стаяла фартэпіяна, на якім іграла маці і дзеля чаго з Вільні выпісваліся ноты.

Першай жонкай Вандаліна была Браніслава, дачка чыноўніка курыі біскупаў у Вільні. З ёй меў сына Рамана Зыгмунта і дачку Ванду Аліну. Пасля смерці Браніславы, у 1888 годзе, Шукевіч ажаніўся другі раз з Юліяй Камінскай. Ад гэтага шлюбу нарадзіліся сыны Зыгмунт і Генрых. Другі шлюб аказаўся вельмі няўдалым, паміж мужам і жонкай не было нічога агульнага. Юлія была асобай простай і не разумела навуковых інтарэсаў мужа, часта сварылася на яго за пакупку кніг і часопісаў. Бо лічыла гэта марнатраўствам часу і грошай. Вельмі крыўдзілася на мужа з-за таго, што ён выдаткоўваў вялікія грошы на раскопкі. Сяброў-вучоных, якія адведвалі Шукевіча ў Начы, называла старымі дармаедамі. Спрэчкі і лаянкі ўсё больш узмацняліся, і ў выніку ў 1902 годзе Юлія пакінула дом мужа і перасялілася да сваіх бацькоў.

«Наша мінулае натхняе на барацьбу»

Паступова Вандалін усё больш паглыбляўся ў заняткі археалогіяй, траціў на гэта ўвесь вольны час. Выбітны рускі археолаг А. Спіцын лічыў, што менавіта Шукевіч знайшоў і даследаваў каменныя магілы. Ён пісаў: «Гонар адкрыцця і даследавання каменных магіл Лідскага павета належыць тутэйшаму землеўладальніку Вандаліну Аляксандравічу Шукевічу (маёнтак Нача)». Каменныя магілы — пахавальныя помнікі X — XVII стагоддзяў, вылучаны сучаснай навукай у асобны археалагічны тып старажытнасцяў беларускага Панямоння.

Паміж 1884 і 1894 гадамі Шукевіч знайшоў 27 пахаванняў у Вензаўшчыне, 14 у Апанаўцах, 39 каля Дварчан, 6 каля Сабакінцаў, 8 каля Забалаці, 7 у Некрушанцах, 19 у Пузелях — усяго 120 пахаванняў у 8 магільніках. Напрыклад, каля Начы, на палях ваколіцы Пузелі, былі раскапаны старадаўнія каменныя магілы, дзе пры мужчынскіх шкілетах знаходзіліся сякеры, нажы, наканечнікі дзіды, а пры жаночых — разнастайныя бронзавыя ўпрыгажэнні: пярсцёнкі, завушніцы, бронзавыя дыядэмы з бронзавымі ці пазалочанымі сярэбранымі падвескамі, шкляныя пацеркі рознай велічыні і шмат іншага.

Стары драўляны касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Начы, пабудаваны ў 1750 годзе, існаваў да 1910 года.

Археалогія стала галоўным захапленнем Вандаліна Шукевіча. Завязаліся знаёмствы з шырокавядомымі вучонымі: Зыгмунтам Глогерам і Эразмам Маеўскім з Варшавы, а таксама перапіска з дацэнтам Уладзімірам Дземетрыкевічам з Кракава, з прафесарамі-археолагамі з Пецярбурга Э. Вальтэрам і А. Спіцыным. «Поспех спадара Шукевіча, — пісаў апошні, — тлумачыцца не столькі багаццем помнікаў даўніны ў раёне яго дзейнасці, колькі сістэматычнасцю яго дзейнасці». Пасля IX археалагічнага з'езда, які адбыўся ў 1893 годзе ў Вільні, Шукевіч наладзіў перапіску і абменьваўся публікацыямі з Маскоўскім археалагічным таварыствам, быў выбраны членам-карэспандэнтам гэтага таварыства.

Восенью 1903 года Шукевічам было зроблена вельмі цікавае, адразу заўважанае ў навуковым свеце, адкрыццё так званых грунтовых магіл. Вандалін Шукевіч даследаваў Трокскі, Лідскі і Радунскі замкі. Вучоны справядліва заўважаў, што «для нас мінулае павінна быць падвойна дарагім, бо ў ім адным мы можам чэрпаць натхненне для барацьбы за нацыянальнае існаванне».

«Браты-беларусы з крыві і косці»

Шукевіч займаўся не толькі навукай і захаваннем гістарычных помнікаў, але і журналістыкай, якая, дарэчы, давала навукоўцу сталы прыбытак. Вывучаючы публікацыі Шукевіча таго часу ў «Кур'еры Літоўскім», удалося адшукаць надзвычай цікавы артыкул земляка ў падтрымку беларускай мовы і адукацыі: «Некаторыя «нават выходзяць з сябе» з абурэння ад смеласці «нейкіх там» беларусаў, якія пачынаюць пачуваць у сабе нацыянальную адметнасць… Пытанні будучыні цэлых народаў не могуць вырашацца іроніяй, падтасоўкай фактаў ці фразеалогіяй узроўню сярэднявечнай схаластыкі. Бо народ, які абуджаецца да супольнага жыцця па ўласнай мадэлі, не патрабуе нянек, не прымае ніякага націску. Насуперак усяму ён выквітнее з часам цудоўнай кветкай цывілізацыі, уносячы новы элемент у духоўны даробак гэтай цывілізацыі». І таму «нельга забываць пра братоў беларусаў з крыві і косці, якія насуперак усяму самаўсведамляюцца і хочуць захаваць сваю нацыянальную адметнасць».

Усё жыццё Шукевіча вельмі цікавіў фалькор, шмат гадоў даследчык збіраў і апрацоўваў этнаграфічны матэрыял. Свае археалагічныя і этнаграфічныя калекцыі Вандалін Шукевіч захоўваў у маёнтку ў Начы, потым перадаў у музей Таварыства сяброў навук у Вільні, а таксама ў зборы Эразма Маеўскага ў Варшаве і ў Этнаграфічны музей у Кракаве.

Віленскія зборы падчас вайны, рэвалюцый і змен улад былі амаль поўнасцю знішчаны і разрабаваны. Затое ў Кракаве, на шчасце, калекцыі Шукевіча захаваліся. Ёсць яны таксама ў музеях Вільні, Кракава і Масквы.

Леанід ЛАЎРЭШ

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже единым лотом имущества, принадлежащего ИЧП «АРМАКАН-ПВХ»,
находящегося по адресу: 231300, г. Волковыск, ул. С. Панковой, 65

№ лота	№ п/п	Наименование и характеристики продаваемого имущества	Начальная цена продажи, руб. (без уплаты НДС)	Задаток, руб. (10% от начальной цены)	Шаг аукциона, %
1	1	Капитальное строение – здание цеха нестандартного оборудования – 1001,0 м. кв., инв. № 410/С-23922 – 226 500 000 рублей.	1 228 161 500	122 816 150	5
	2	Капитальное строение – здание экспериментального участка – 908,9 м. кв., инв. № 410/С-25476 – 273 500 000 рублей.			
	3	Капитальное строение – рама лесопильная – 356,6 м. кв., инв. № 410/С-25474 – 101 500 000 рублей.			
	4	Капитальное строение – будка сторожевая – 8,6 м. кв., инв. № 0000004/410/С-25475 – 3 940 000 рублей.			
	5	Капитальное строение – склад – теплица 1150,9 м. кв., инв. № 410/С-25473 – 235 500 000 рублей			
	6	Сооружение – склад № 6 пиломатериалов 152,85 м, с инв. № 410/С-25472 – 26 100 000 рублей.			
	7	Сооружение – ограждение, 502,7 м, с инв. № 410/С-25478 – 68 500 000 рублей.			
	8	Сооружение – внутризаводские автомобильные дороги, а/б, – 377 м, с инв. № 410/С-25479 – 258 500 000 рублей.			
	9	Сооружение – внутренние ж/д пути – 210,4 м, с инв. № 410/С-25477 – 32 450 000 рублей.			
	10	Перегородка из стального листа 0,5/2,5/14 – 156 500 рублей.			
	11	КТП 1000/100/0,4 (внутренней установки) – 1 444 000 рублей.			
	12	Распределительный пункт 9272 – 35 500 рублей.			
	13	Распределительный пункт 9272 – 35 500 рублей.			

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке 2,1530 га, кадастровый номер 420850100001009235.

Аукцион состоится 03 декабря 2014 года в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. С. Панковой, 65, к. 216 (2 эт.). Заключительная регистрация участников аукциона 03 декабря 2014 года с 10.30. до 11.00.

Организатор аукциона – управляющий ИЧП «АРМАКАН-ПВХ» Бахуревич Е. В., тел. (8-029) 3608384.

Для участия в аукционе необходимо:

1. **Оплатить задаток** на расчетный счет 3012015893504 в филиале № 402 ОАО «СБ «Беларусбанк» г. Волковыск, код 689, УНП 590740021.

2. **По 02 декабря 2014 г. включительно до 16.00 подать заявление** на участие в аукционе и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: 230025, г. Гродно-25, а/я 13.

В случае если аукцион признан не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать свое заявление на участие в нем. Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом от участия в аукционе. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победителем аукциона будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем аукциона, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Более подробная информация об условиях участия в аукционе, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Рэспубліка» от 19.06.2014.

Дополнительная информация по телефону организатора аукциона: 8029-360-8384.

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ООО «Ньюз Девелоп» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

здания приемного пункта стеклотары № 94,

общ. пл. 143 кв.м, инвентарный номер 500/С-25862, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Сердича, 10А.

Начальная цена с НДС – 500 000 долларов США.
Площадь земельного участка – **0,0755 га**
(предоставлен продавцу на праве временного пользования).

Задаток 10% от начальной цены в белорусских рублях по курсу Нацбанка РБ на дату платежа перечисляется на р/с № 3012343260010 в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **6 декабря 2014 в 10 ч. 00 мин. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04 декабря 2014 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.**

Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by.
E-mail: auction@cpo.by

Технический администратор доменной зоны BY
УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ»

сообщает о проведении благотворительного аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра. Средства от аукциона, кроме стандартной стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут перечислены на нужды детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей.

Предметом аукциона являются доменные имена в доменной зоне BY, исключенные из реестра национальной доменной зоны. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещается на сайте https://auction.cctld.by.

Дата начала аукциона – 8 декабря 2014 г., дата окончания аукциона – 18 декабря 2014 г.

Время начала аукциона – 12.00 часов даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 часов даты окончания аукциона. В случае, если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.

Аукцион проводится на интернет-ресурсе http://auction.cctld.by.

В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.

Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или нерезидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте http://auction.cctld.by

Начальная цена предмета аукциона составляет 300 000 белорусских рублей. Шаг аукциона – 50 000 белорусских рублей.

Прием ставок прекращается по истечении 10 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.

Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.

Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.

Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра, находится на сайте http://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов».

Организатор аукциона: УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by
Тел. организатора +375 17 239 57 02.
Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 77.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
8 декабря 2014 г. проводит открытый аукцион № 10-Сф-14
по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены).
Предмет аукциона: право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляются 6 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных блокированных жилых домов в г. Минске (в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества – для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме):

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	2	3	4	5	6	7
1.	ул. Теннистая, 31 (Первомайский район)	500000000009005569	0,0437	248 667 590	37 000 000	12 150 520
2.	пер. Малый Тростенец, 15А-2 (Заводской район)	500000000002008473	0,0604	250 208 940	37 000 000	12 150 520
3.	ул. Малый Тростенец, 15А (Заводской район)	500000000002008471	0,1054	436 616 620	65 000 000	12 150 520
4.	ул. Малый Тростенец, 1А -1 (Заводской район)	500000000002008470	0,0787	326 011 470	49 000 000	12 150 520
5.	пер. Малый Тростенец, 12А (Заводской район)	500000000002008469	0,0922	381 935 900	57 000 000	12 150 520
6.	пер. Малый Тростенец, 7А (Заводской район)	500000000002008472	0,1320	546 807 200	82 000 000	12 150 520

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Условия, предусмотренные в решении Минского горисполкома о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного блокированного жилого дома.

Аукцион состоится 8 декабря 2014 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток (задатки) **не позднее 2 декабря 2014 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 10 ноября по 2 декабря 2014 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за земельный участок. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, **решение Мингорисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.**

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора торгов www.mgcn.by.

УП ИНСТИТУТ «БЕЛПРОМСТРОЙПРОЕКТ»
ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ
ПО ВЫБОРУ СУБПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ
для выполнения раздела «Телемеханизация трансформаторной подстанции» по пунктам 5,6 ТУ на электроснабжение (релейная защита и передача сигналов на ОДУ) по объекту:

«Реконструкция производственного корпуса с расширением площади и реконструкцией открытой площадки с крановой эстакадой под склад металла с выделением пусковых комплексов по ул. Бабушкина, 10».

УНП 100049147

Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости» СООБЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ СЛЕДУЮЩИХ ИЗМЕНЕНИЙ
в извещение о проведении 26 ноября 2014 года 161-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (опубликовано в газете «Звязда» 22.10.2014):

- текст графы 4 таблицы по предмету аукциона № 91 «1,35 БАВ (137700) 3,0» заменяется цифрами «3,0»;
- текст графы 4 таблицы по предметам аукциона №№ 92-126 «0,5 БАВ (51000) 1,0» заменяется цифрами «1,0».

Телефон для справок **+375 (17) 327 40 22.** Адрес в сети интернет: **www.mgcn.by.**

УНП 190398583

ОАО «Гомельхлебопродукт»

извещает своих акционеров о проведении внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Гомельхлебопродукт» 18 ноября 2014 года.

Повестка дня:
1. Избрание членов наблюдательного совета общества.

Собрание состоится по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, ОАО «Гомельхлебопродукт». Начало в 14.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, тел.: (8-0232) 72-59-40.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 400010980 *Наблюдательный совет ОАО «Гомельхлебопродукт».*

ГРОДНЕНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ информирует, что 27 октября 2014 г.
ПОДВЕДЕНЫ ИТОГИ В КОНКУРСЕ
ПО ВЫБОРУ ЗАКАЗЧИКА (ЗАСТРОЙЩИКА) ПО СТРОИТЕЛЬСТВУ МНОГОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ, за исключением жилых домов повышенной комфортности, в городе Гродно в районе улиц Татарской-Комбайнерской и в районе улицы Пролетарской, и победителем признан ОАО «Гродножилстрой».

УНП 500199703

Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску бланк полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВР № 1652031 **считать недействительным.**

УНП 100122726

УП ИНСТИТУТ «БЕЛПРОМСТРОЙПРОЕКТ»
ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ
по выбору субподрядной организации для выполнения раздела «Автоматическое пожаротушение» по объекту:

«Хозяйственный корпус с гаражом по проспекту Дзержинского, 69/1».

УНП 100049147

Утерянное свидетельство о государственной регистрации Частного предприятия «Информдизайн-8» УНП №190414895 **считать недействительным.**

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ

по продаже базы отдыха «Суя»,

расположенной по адресу: Витебская область, Полоцкий р-н, берег оз. Суя и принадлежащей ОАО «Нафтан» (Продавец).

Земельный участок площадью 3,2374 га с кадастровым номером 223882300001000031.

Целевое назначение – использование под базу отдыха. Право постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав:
- водоохранная зона озера Суя, площадь 3,2374 га;
- охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, площадь 0,0424 га.

На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион.

Начальная цена с НДС – 754 426 530 бел. руб.
Задаток с НДС – 40 000 000 бел. руб.

Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Нафтан», **проводимом 19 ноября 2014 г.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 5% (пять процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан заключить договор аренды, находящихся в государственной собственности участков водопроводной и канализационной сетей, обслуживающих базу отдыха.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) отдельно возмещает сумму затрат, понесенных Продавцом:
- на услуги по определению физического износа объектов недвижимости, накопленная амортизация которых по данным бухгалтерского учета на дату оценки составила более 50% от переоцененной стоимости в сумме 17 956 800 (Семнадцать миллионов девятьсот пятьдесят шесть тысяч восемьсот) белорусских рублей;
- на размещение извещения о проведении аукциона и информации об аукционе.

Аукцион состоится **19.11.2014 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 17.11.2014 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Сельская газета» от 06.09.2014.

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **www.ino.by.**

☎ Дополнительная информация: 8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52 • www.ino.by • 5538325@mail.ru

---

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
27 ноября 2014 г. проводит повторный открытый аукцион № 21-А-14 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены).
Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право аренды на 5 лет 9 земельных участков для строительства объектов недвижимости в г. Минске:

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)	Условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	ул. Кижеватова	500000000004005243	0,5687	комплекс сервисного обслуживания с благоустройством территории и сохранением водного объекта/земельный участок для размещения объектов иного назначения	810 654 010	120 000 000	19 678 295	Обязательства землепользователя по регистрации имущественных прав на земельный участок, а также по своевременному проектированию объектов и освоению земельного участка.
2	ул. Селицкого	500000000002008390	1,6224	ресторанный комплекс с благоустройством территории и сохранением водного объекта/земельный участок для размещения объектов общественного питания	2 784 920 580	418 000 000	25 982 752	
3	ул. Космонавтов	500000000005006820	0,3600	кафе с развлекательным детским центром/земельный участок для размещения объектов иного назначения	718 483 080	108 000 000	25 502 253	
4	ул. Ромашкина – ул. Авиации (микрорайон Сокол)	500000000004005139	0,2519	торгово-обслуживающий объект/земельный участок для размещения объектов иного назначения	332 235 200	50 000 000	17 869 506	
5	ул. Ромашкина (микрорайон Сокол)	500000000004005148	0,1000	кафе/ земельный участок для размещения объектов общественного питания	131 891 320	20 000 000	19 901 293	
6	В районе пересадочного узла «Восточный» – станция метро «Пролетарская»	500000000003004367	0,1028	временный объект торговли и общественного питания (срок эксплуатации не более 10 лет)/земельный участок для размещения объектов иного назначения	236 944 680	30 000 000	14 264 174	
7	В районе пересадочного узла «Восточный» – станция метро «Пролетарская»	500000000003004387	0,1800	временный объект торговли и общественного питания (срок эксплуатации не более 10 лет)/ земельный участок для размещения объектов иного назначения	418 539 300	63 000 000	16 232 710	
8	ул. Бабушкина (промузел Колядичи)	500000000004005112	4,6322	производственный объект/земельный участок для размещения объектов иного назначения	3 810 791 850	572 000 000	35 436 039	Возместить потери сельскохозяйственного производства в размере 1 147 947 687 руб. с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения.
9	ул. Рафиева	500000000005006651	0,9300	зрелищно-познавательный объект/земельный участок для размещения объектов культурно-просветительного и зрелищного назначения	1 609 384 520	241 000 000	18 161 381	Возместить потери сельскохозяйственного производства в размере 80 975 363 руб. с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится 27 ноября 2014 г. в 16⁰⁰ по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток (задатки) не позднее 21 ноября 2014 г. в вышеуказанном (графа 7 таблицы) размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 10 ноября 2014 г. по 21 ноября 2014 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия не менее двух участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона (в предусмотренных законодательством случаях) в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта должен приступить к занятию земельного участка (начать строительство – осуществление строительно-монтажных работ в соответствии с утвержденной проектной документацией) в соответствии с целью и условиями его предоставления. В случае невыполнения данного требования право пользования (аренды) земельного участка прекращается в установленном порядке.

До истечения срока аренды земельного участка (5 лет) лицо, которому он предоставлен по результатам аукциона, в установленном порядке и сроки обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок в аренду на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.

■ Кантрамарка

ДАВАЙЦЕ НАПІШАМ ПРА ВАС П'ЕСУ!

На батарэі ў ванным пакоі між сабой ціха гамоняць шкарпэткі. Беларускі сантэхнік выйграе конкурс па саломапляценні і адпраўляецца па прыз у Лондан. Звычайны чалавек Сцяпан прагне цішыні і паспявае пражыць 12 жыццяў. Што адбываецца? У Брэсцкім абласным тэатры драмы распачаўся праект сцэнічных чытанняў сучаснай беларускай драматургіі.

Фота Вольгі ЖУК.

АСЦЯРОЖНА, ПАМІДОРЫ!

25 кастрычніка на малой сцэне Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы чыткай п'есы Сяргея Анцалевіча «Асцярожна, памідоры!» распачаўся праект сцэнічных чытанняў сучаснай беларускай драматургіі. Ініцыятарам праекта выступіў малады рэжысёр Дзяніс Фёдараў.

За гастранамічна-гігіенічнай назвай тэксту насамрэч прыхавана гісторыя пра складаны шлях чалавека да Бога, на якім студэнту Фёдару сустрэліся розныя людзі: бабуля, што страціла розум і вяжа шкарпэткі на ўсю савецкую армію; дзяўчына, якая не пагаджаецца прыняць дзесяць долараў ад незнаёмкі; жанчына з двума слоікамі святой вады і нянавісцю да бруднага жабрака; кампанія наркаманаў. Дапамагалі яны Фёдару ці, наадварот, збівалі з панталыку, можна было вызначыць на абмеркаванні пасля чытання. Дыскусія атрымалася вострай, але прадказальнай: больш за сэнсавыя супярэчнасці п'есы гледачоў (і прафесійную публіку, і простых тэатралаў) цікавілі пытанні, якія звычайна правакуюць тэксты сучасных драматургаў. Ці драматургія гэта? Вось Чэхаў (Шэкспір, Томас Ман, Іосіф Бродскі — спіс можаце падоўжыць згодна з уласнымі зацікаўленасцямі) пісаў без мату (паказваў жыццё прыгожым, выводзіў мараль, пакідаў у захапленні ад мовы і г.д.), а вы? Як гэта ставіць і ці варта гэта ставіць? Як у такім матэрыяле існаваць акцёру? Рэжысёра Дзяніса Фёдарава вострыя, а часам і правакацыйныя выказванні не збянтэжылі, а ўзрадавалі: дыялог пачаўся. У хуткім часе ён плануе прачытаць у межах праекта п'есы беларускіх драматургаў, што ўвайшлі ў сёлетнюю праграму расійскага фестывалю маладой драматургіі «Любімаўка» («Лондан» Максіма Дасько і «Двое лішніх, трэці — занадта» Лёхі Чыканаса), п'есу «Знешнія пабочныя» Дзмітрыя Багаслаўскага ды іншыя тэксты.

ТЭАТР ЯК ХАЛОДНЫ ДУШ

Праект сцэнічных чытанняў — не першая спроба Дзяніса Фёдарава папрацаваць з сучаснымі тэкстамі ў брэсцкім тэатры — у 2013 годзе рэжысёр паставіў на малой сцэне п'есу «Ураджай» Паўла Пражко, чыя творчасць стала прычынай з'яўлення выслоўя «феномен беларускай драматургіі». Праца над гэтай п'есай прымусіла Фёдарава задумацца пра дыялог з гледачом, які не павінен абмяжоўвацца выключна паказам спектакля.

— «Ураджай» атрымаўся рэзанансная пастаноўкай. Але ў выніку ён дапамог і дапамагае тэатру шукаць новыя шляхі працы з гледачом. Пасля першых двух паказаў мы вымушаны былі адмовіцца ад продажу на яго квіткоў праз распаўсюднікаў, якія звычайна працуюць з прадпрыемствамі. Бо спачатку прыходзілі непадрыхтаваныя гледачы, для якіх тэкст Пражко быў, як халодны душ. Пачалі прадаваць квіткі выключна праз касу: тлумачыць гледачам нейкія, як у гэтай п'есе!» А тэатр будзе пытацца: «А якія? Такія? Такія?» Не падыходзіць? Давайце напішам пра вас п'есу! Сёння глядач збольшага ідзе ў тэатр, як у музей, але ж тэатральнаму мастацтву ўласцівы зусім іншыя функцыі. Тэатр мусіць быць сацыяльным, рэагаваць на праблемы грамадства.

ВЫБУХІ І ПРАВАКАЦЫІ

Хацелася б заўважыць, што праект Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы выразна праяўляе тэндэнцыю сучаснага тэатральнага працэсу. Брэсцкім чытанням некалькі гадоў таму папярэднічалі «Чытанні» магілёўскія — праект, які зладзіла колішні галоўны рэжысёр Магілёўскага тэатра драмы Кацярына Аверкава. Паралелі робяць заўважнай паспяховую формулу, якая працуе на ажыўленне тэатральнага працэсу ў рэгіёнах, з'яўленне там тэатральных лабараторый і студый. Міжнародны тэатральны фестываль (у Брэсце — «Белая Вежа», у Магілёве — «М@рт.кантакт») штогод здзяйсняюць як мастацкі выбух, які ўздзейнічае як на тэатральных дзеячаў, так і на звычайных гледачоў, і правакуюць іх на стварэнне і ўспрыманне сталага эксперыментальнага працэсу. Дарэчы тэатральная лабараторыя працуе не толькі на эксперыменты, але і на рэпертуар, куды ўключаюцца лепшыя яе вынаходкі. Так, у рэпертуар Магілёўскага драматычнага тэатра ўвайшлі спектаклі «Гаспадар кавярні» Паўла Пражко (рэжысёр Кацярына Аверкава), «Аднакласнікі» паводле п'есы Юліі Чарняўскай «Літаркі» (рэжысёр Кацярына Аверкава) і «Норд-Ост» нямецкага драматурга Торстэна Бухштайнера (рэжысёр Уладзімір Пятровіч).

Ці з'явіцца на афішах Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы назва п'есы Сяргея Анцалевіча, стане зразумела з цягам часу. Пакуль што перад тымі, хто робіць праект, іншая задача: працаваць на працэс, а не на вынік, і прачытаць у лістападзе п'есу Максіма Дасько «Лондан» пра сантэхніка Гену, які кранальна сумаваў па радзіме ў Вялікабрытаніі.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

■ Нефармат

Калі вырашаеш у адзіночку

ГЭТА не першая падобная акцыя ДАІ, і раней клалі манекены на дарогу. Але паведамленне пра яе асабліва зачапіла, таму што эксперымент праводзілі, па сутнасці, на вясковай дарозе. Супрацоўнікі абласной аўтаінспекцыі паклалі манекен, вельмі падобны на збітага веласіпедыста, на дарозе паміж вёскамі Дзівін і Павіцце Кобрынскага раёна. Побач валяўся веласіпед. Адным словам, карціна выглядала, як наступствы сапраўднай аварыі. З 29 вадзіцеляў, якія за пэўны час праехалі па дарозе, спыніліся толькі чацвёра. Астатнія праехалі міма: хто прытарможваў, глядзеў на «ахвяру дарожнага здарэння», а хто гнаў на поўнай хуткасці далей. І гэта ў асноўным вясковыя людзі або гарадскія дзеці вясковых людзей!

Вось яшчэ адзін выпадак, ужо з гарадскога жыцця і, на вялікі жаль, не з манекенам. Я пісала пра трагедыю ў Брэсце 24 кастрычніка, калі другакласнік загінуў пад коламі аўтобуса. Дзіця выехала на веласіпедзе на пешаходны пераход акурат на скрыжаванні, а вадзіцель, што паварочваў, не заўважыў яго і збіў. Дык вось, калі хлопчык ляжаў, заціснуты колам вялізнай машыны, яму на дапамогу кінуліся вучні 10-га класа той жа школы, дзе вучыўся няшчасны. Яны якраз ішлі на заняткі. Міхаіл Б. і Аляксандр Ц. спрабавалі вызваліць ахвяру дарожнай аварыі, але не змаглі гэта зрабіць да прыезду міліцыі і «хуткай». Яны прыйшлі ў клас з запэцканымі крывёю рукамі і ў іх здарылася нешта накшталт нервовай істэрыкі. Потым, калі хлопцы трошкі прыйшлі ў сябе, яны расказвалі аднакласнікам, што разам з імі дапамогу збітаму малому спрабаваў аказаць толькі адзін дарослы дзядзька. Усе астатнія праходзілі міма. Вуліца Луцкая не самая людная ў Брэсце, побач прыватны сектар, але ў «час пік», каля васьмі раніцы, на тым злашчасным скрыжаванні дарогу пераходзіць дакладна не адзін чалавек... У гэтым канкрэтным выпадку выратаваць было ўжо немагчыма. Але ж тыя, хто праходзіў побач, гэтага не ведалі. Бывае, у такіх сітуацыях пытанне жыцця і смерці вырашаюць хвіліны.

Калі ж мы сталі такімі абыякавымі, няўважлівымі? Ці мы такімі былі? Здараецца, ёсць нагода думаць зусім інакш. Скажам, як было летась у сакавіку, калі на Беларусь абрынуўся цыклон «Хаўер», і многія аказаліся літаральна замеценымі снегам на дарозе. Потым на ўсіх форумах пісалі, як людзі праяўлялі сапраўдную спагаду, як дапамагалі адно аднаму, як дзяліліся кубкам гарачага чаю. Хацелася радавацца за суайчыннікаў. Іншым разам пачынаеш нават ганарыцца, калі інтэрнэт-карыстальнікі і іншыя людзі хутка збяруць патрэбную суму грошай на аперацыю і лячэнне ці прапануюць нейкую канкрэтную дапамогу зусім незнаёмаму чалавеку. Парадуешся, паганарышся, а потым зойдзеш у паліклініку, у транспарт, на пошту — і зноў цябе нібы халоднай вадой абліюць.

У паліклініцы нядаўна была сведкай, як мажны высокі дзяцюк стаў у дзвярах кабінета хірурга, каб не прапусціць дзяўчыну на мыліцах, якую сваячка намервалася завесці без чаргі. І ўсе ў той даволі вялікай чарзе спачувалі, хоць і не ўсім было сядзець лёгка: хто пасля аперацыі, хто са здымкам пасля траўмы. Але большасць маўчала, бо было відаць, як цяжка не толькі самой хворай, але і жанчыне, якая яе суправаджала. І толькі гэты пайшоў «на прынцып», засланіў сабою дзверы, сказаў, што ўсе тут нездаровыя і няма чаго ціснуць на шкадаванне. Потым чарзе давялося выслухаць яго прэтэнзіі наконт парадку ў паліклініцы, медыцыны ў цэлым і стаўленню да яго, падаткаплацельшчыка. На якой рабоце ён зарабляе падаткі ў дзяржаўную казну, пацыент не ўдакладняў. Але яго выгляд — спартыўныя штаны, залаты ланцужок на шыі такой таўшчыні, што на яго, пэўна, можна было б прывязаць невялікага сабачку — ніяк не дазваляў угадаць нават прыблізна характар работы, ад якой грамадзянін рэгулярна адлічвае падаткі. Адна бабулька ціха прамовіла: «Хіба рэкецірам працуе» і агучыла тым самым думкі многіх. Ён ведае, што яму трэба ў гэтую хвіліну, а астатніх нібы і няма. Якія там чалавечыя адносіны, увага, спагада. Ім даўно знойдзена замена.

Ды ўзяць хаця б сцэну ў транспарце, якую даводзіцца назіраць ледзь не штодня. Вось і сёння ў аўтобусе паднялася са свайго месца даволі пажылая жанчына, каб пасадзіць маладзіцу з маленькім дзіцем са словамі: «Сядайце, мужыкі ў нас перавяліся». А іх, розных узростаў, у тым ліку, маладых, сядзела даволі. Толькі вось ніхто не пажадаў «заўважыць» маладую маці з дзіцем.

Гэтыя людзі потым у сусветнай электроннай «сметніцы», на ўласнай кухні за чаркай, у кампаніі сябрукоў з півам нярэдка разносяць у пыл сістэму, уладу, адукацыю і медыцыну, блізкіх і далёкіх, пэўна знаходзячы ў гэтым нейкае самасцвярджэнне. Ім і няўцям, што жыццё яны ствараюць самі, калі прымаюць рашэнне нават у дробязях, у адзіночку, без прымусу. Спыніцца ці не спыніцца на дарозе, праявіць чалавечнасць альбо прадэманстраваць хамства ў чарзе ці ў транспарце. Правільней сказаць, вырашаюць нават не ў адзіночку, а разам са сваім сумленнем...

Святлана ЯСКЕВІЧ

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛІСТАПАД

4 лістапада, *аўторак*. Стрыжка паскарае рост валасоў, але са стратай іх якасці.

5 лістапада, *серада*. Неспрыяльны час для стрыжкі. Могуць адбыцца негатыўныя падзеі ў жыцці.

6 лістапада, *чацвер*. Добры дзень для наведвання цырульніка. Валасы хутка растуць, становяцца здаровымі, не выпадаюць, менш сякуцца.

7 лістапада, *пятніца*. Добры дзень для стрыжкі валасоў. Разам з абстрыжанымі кончыкамі знікне і частка набалелых праблем.

8 лістапада, *субота*. Нейтральны дзень для стрыжкі.

9 лістапада, *нядзеля*. У гэты дзень можна афарбоўваць валасы, рабіць стрыжку.

10 лістапада, *панядзелак*. Абразанне валасоў у гэты дзень можа мець згубны ўплыў на псіхіку. Прыгнечанасць, беспадстаўная трывога — самае малое, што можа з'явіцца пасля паходу ў цырульню.

11 лістапада, *аўторак*. Варта ўстрымацца ад стрыжкі. Гэта дзень пасіўнасці і назірання, але ніяк не змены іміджу.

12 лістапада, *серада*. Стрыжка, укладка, афарбоўванне і асвятленне валасоў атрымаюцца на дзіва ўдалымі.

13 лістапада, *чацвер*. Добры дзень для стрыжкі. У выніку вы атрымаеце прыгажосць і ўнутраную гармонію.

14 лістапада, *пятніца*. На календары стрыжак выдатны дзень для наведвання цырульніка.

15 лістапада, *субота*. Стрыжка ў гэты дзень спрыяе актывізацыі жыцця.

16 лістапада, *нядзеля*. Надзвычай спрыяльны дзень. Пасля стрыжкі валасы будуць хутка расці, стануць мацнейшымі.

17 лістапада, *панядзелак*. Добры час для таго, каб стварыць выдатную прычоску.

18 лістапада, *аўторак*. Спрыяльны дзень для стрыжкі ці стварэння прычоскі, прыцягне да вас радасць і шчасце.

19 лістапада, *серада*. Нічога новага стрыжка ў гэты дзень у жыццё не прынясе, але атрымаецца прыгожай і ўдалай, што пазітыўна паўплывае на настрой.

20 лістапада, *чацвер*. Дваістае становішча Месяца ў знаку задыяка. Неспадзяваны вынік.

21 лістапада, *пятніца*. Самы дрэнны дзень месяцовага календара для стрыжкі.

22 лістапада, *субота*. Добры дзень для стрыжкі, але вельмі кароткую прычоску рабіць не варта — гэта можа выклікаць праблемы ў матэрыяльнай сферы.

23 лістапада, *нядзеля*. Афарбоўванне і стрыжка валасоў дадасць у ваша жыццё радасці і аптымізму.

24 лістапада, *панядзелак*. Спрыяльны дзень для стрыжкі і ўсіх маніпуляцый з валасамі. Валасы стануць больш паслухмянымі, здаровымі, густымі.

25 лістапада, *аўторак*. Добры дзень для наведвання цырульніка. Асабліва ўдалай тады будзе ўкладка.

26 лістапада, *серада*. У гэты дзень лепш пазбягаць стрыжкі і ўсіх маніпуляцый з валасамі. Інакш у выніку можуць выпадаць валасы.

27 лістапада, *чацвер*. Вельмі неспрыяльны дзень для стрыжкі, можа з'явіцца перхаць.

28 лістапада, *пятніца*. Сёння добры дзень для таго, каб зрабіць кардынальна новую прычоску.

29 лістапада, *субота*. Неспрыяльны дзень для наведвання салона прыгажосці.

30 лістапада, *нядзеля*. Неспрыяльны час для стрыжкі. Калі стрыгчы валасы ў гэты дзень, то ўзнікнуць праблемы, перашкоды і хваробы.

Даты Падзеі Людзі

4 ЛІСТАПАДА

1815 год — нарадзіўся (вёска Кублічы, цяпер Ушацкі раён) Арцём Ігнатавіч Вярыга-Дарэўскі, беларускі пісьменнік. Яго творы з-за цэнзурных пераследаванняў не друкаваліся, рукапісы іх не знойдзены. Апублікаваны толькі «Плач салдаткі». У 1858-1863 гадах вёў «Альбом» — унікальны помнік беларускай культуры. Аўтар вершаванай імправізацыі «Літвіны, што запісаліся ў мой Альбом на развітанне» (дайшла копія). Першым пераклаў на беларускую мову «Конрада Валенрода» А. Міцкевіча. За ўдзел у паўстанні 1863-1864 гг. сасланы ў Сібір, дзе памёр у 1884-м.

1887 год — нарадзіўся Цішка Гартны (сапр. Жылуновіч Зміцер Фёдаравіч), беларускі пісьменнік, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі (1928). Пасля 1917 года — сакратар Беларускага нацыянальнага камісарыята пры ўрадзе РСФСР, рэдактар газеты «Дзянніца», узначальваў Дзяржаўнае выдавецтва БССР, працаваў у Наркамаце асветы і ў Інстытуце гісторыі АН Беларусі. Выступаў як паэт, празаік, драматург, публіцыст, даследчык беларускай літаратуры і крытык. Аўтар раманаў «Сокі цаліны» і «Перагуды», зборнікаў апавяданняў «Трэскі на хвалях», «Алея». У 1936 г. арыштаваны, у 1937-м памёр. Рэабілітаваны ў 1988 годзе. Яго імем названы вуліцы ў Мінску, Капылі і іншых гарадах.

1890 год — у Лондане адкрыта першае метро, найстарэйшая ў свеце падземная гарадская чыгунка. Першая яе чарга Падынгтан — Фарынгдан, названая «Метрапалітэн-лайн», была пушчана ў 1863 годзе. Назва гэтай лініі стала агульнай: «метрапалітэн» азначае гарадскую сістэму нявулічнага рэйкавага транспарту. 4 лістапада 1890 года ў Лондане адкрылася першая ў свеце лінія метро на электрычнай цязе — гэта была Паўночная лінія на ўчастку Стоквел-Кінг — Уільям-Стрыт. Адкрыў рух будучы кароль Вялікабрытаніі — прынц Эдуард. Цяпер Лонданскі метрапалітэн налічвае каля 270 станцый, а працягласць яго пуцей складае больш за 400 кіламетраў.

Было сказана

Уладзімір ДУБОЎКА, паэт, празаік, мовазнаўца:

«А часам, мабыць, і не лішне
Прайсці па сцежачках калішніх,
Так сэрцу любых і знаёмых,
З якіх выходзілі ў жыццё мы...».



Гэта сапраўдныя барацьбіты, якія дэманструюць непераўзыдзеную ўпартасць і вытрымку. Яны не любяць спяшацца і заўсёды перакананы, што час на іх баку. Народжаныя ў гэты дзень не любяць прайграваць і саступаць, у якой бы сферы жыцця яны ні працавалі, але разам з тым яны не толькі пераможцы, але яшчэ і ахвяры, якія могуць патануць у асабістых няшчасцях, закрыцца ў сабе. На эмацыянальным уздыме яны могуць стаць нават парывістымі і непрадказальнымі. Ім неабходна навучыцца стрымліваць агрэсіўныя рысы свайго характару і выказваць свае эмоцыі больш гарманічна і спакойна, суцішваць сваю нецярплівасць і навучыцца дараваць іншым іх памылкі.

Яны валодаюць схільнасцю да супярэчлівасці. Іх словы і справы з'яўляюцца моцным стымулам для іншых, а самі яны імкнуцца займаць дамінантнае становішча і стаць каштоўнымі членамі сям'і і грамадства. Яны здаюцца энергічнымі адкрытымі людзьмі; ім неабходна навучыцца кіраваць сваёй энергіяй, рэалістычна падыходзіць да вызначэння задач, заставацца творчымі ў сваім стаўленні да жыцця. Яны валодаюць цудоўным пачуццём гумару. Народжаным 4 лістапада даспадобы паслугі, якія ім аказваюцца, але пры гэтым паслугі аплочваюцца ўтрая. Людзі гэтага дня вылучаюцца павышанай эмацыянальнасцю, асабліва ў дачыненні да блізкіх, сваякоў, таму ім неабходна пазбягаць празмернай залежнасці ад навакольных.

Сардэчна віншуем
з днём нараджэння
намесніка галоўнага ўрача
па медыка-санітарнай частцы
медсанчасці ААТ «МАЗ»
Ларысу Паўлаўну ЮРЭВІЧ.
Зычым шчасця, доўгіх гадоў
жыцця, і каб усе дні былі сонечныя!
Калектыў МСЧ ААТ «МАЗ».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.15	17.30	9.15
Віцебск	8.15	17.30	9.15
Магілёў	8.05	17.20	9.15
Гомель	7.57	17.22	9.25
Гродна	8.29	17.46	9.17
Брэст	8.25	17.52	9.27

Месяц

Поўня 6 лістапада.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Ганны, Лізаветы, Аляксандра, Антона.*
К. *Яны, Альгерда, Віталя, Кароля.*

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +14..+16°С	КІЕЎ +9..+11°С	РЫГА +8..+10°С
ВІЛЬНЮС +11..+13°С	МАСКВА +4..+6°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +6..+8°С

УСМІХНЕМСЯ

Хацеў купіць піва да футбола. Успомніў, што гуляюць нашы. Узяў гарэлку.

Бацька сыну тлумачыць матэматыку.

— Сынок, глядзі: у мяне 85 тысяч рублёў. У мамы 15 тысяч. Колькі грошай у мамы?

— 100 тысяч!

— Правільна, сынок.

Людзі думаюць, што яны індывідуальныя, а вераць «калектыўным» гараскопам...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 19.669. Індэкс 63850. Зак. № 4524.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 лістапада 2014 года.